Москва
ЦК ВКП(б) Сельхозотдел комната 639
на 1934 г. Іосифову

Комуністычн...

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ВЦК і СНК БССР

САКАВІК 20 АЎТОРАК 1934 г. № 62 (4895) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б АБ ЗАМЕТКАХ У ГАЗЕЦЕ «СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЕ ЗЕМЛЕДЕЛИЕ».

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — ДАЦЬ ПРАДУКЦЫЮ ЛЕПШАЙ У СВЕЦЕ ЯКАСЦІ. ДА ВЫТВОРЧА-ТЭХНІЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ. АКАД. **С. Я. ВАЛЬФСОН** — «РАСАВАЯ НАВУКА НА СЛУЖБЕ ФАШЫЗМА. **Я. ЯРМАШЭВІЧ** — НОВЫЯ ВІДЫ СЫРАВІНЫ ДЛЯ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.

НА ДАПАМОГУ ЧЭЛЮСКІНЦАМ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ЎРАДАВАЙ КАМІСІІ. ДЗІРЫЖАБЛІ Ў АРКТЫЦЫ — ГУТАРКА З КАМАНДЗІРАМ СТРАТАСТАТА «СССР» тав. **ПРАКОФ'ЕВЫМ.**

ЗА МЯЖОЙ:

ЗАБАСТОВАЧНЫЯ БАІ ІСПАНСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА ПРАДАЎЖАЮЦЦА.

УСЕ СІЛЫ НА ПАДРЫХТОЎКУ І ПРАВЯДЗЕННЕ РАННЯЙ СЯЎБЫ

Даць прадукцыю лепшай у свеце якасці

«СІЛА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, ШТО ЦЯПЕР МЫ МОЖАМ ІСЦІ ПА ШЛЯХУ ПАДЁМУ ДОБРАБЫТУ ПРАЦОЎНЫХ ЯШЧЭ ХУТЧЭЙ» (Молатаў).

Харчовая прамысловасць ёсць адна з важнейшых галін народнай гаспадаркі. Партыя ўдзяляла і ўдзяляе выключную ўвагу харчовай індустрыі. Прырост валавой прадукцыі ў 1934 годзе па харчовай прамысловасці БССР вызначан на 19,5 проц., у тым ліку па прамысловасці Наркамснаба—на 32,7 проц., а па ўсёй прамысловасці БССР прырост вызначан у 18,2 проц.

За апошнія гады харчовая прамысловасць тэхнічна ўзброілася. У 1934 годзе асігнуецца на будаўніцтва новых прадпрыемстваў і далейшую рэканструкцыю заводаў харчовай прамысловасці каля 16 млн. руб пёў. Харчовая прамысловасць мае ўжо значную колькасць кваліфікаваных спецыялістаў. Ёсць навукова-даследчыя ўстановы, якія не мала далі каштоўных работ, асабліва па адшуканню новых відаў сыравіны.

РЭАЛЬНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ВЫКАНАННЯ ПЛАНА Ў НАЯЎНАСЦІ.

АЛЕ ТРЭБА ПРАМА СКАЗАЦЬ, ШТО ХАРЧОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БССР ПРАЦУЕ ЯЎНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА. Толькі за адзін тыдзень 1934 г. прадпрыемствы харчовай прамысловасці БССР недадалі пролетарскай дзяржаве прадукцыі на 6 з лішкам мільёнаў рублёў.

Барацьба за якасць прадукцыі яшчэ не стала штодзённым стылем работы.

Вытворчая тэхнічная канферэнцыя харчовай прамысловасці, якая сёння адкрываецца ў Менску, павінна паставіць ва ўсю шырыню пытанне аб рабоце ўсіх звенняў — ад наркамата да прадпрыемства.

Прайшло ўжо больш двух з паловай месяцаў з дня апублікавання звароту ЦК ВКП(б) аб рабоце харчовай прамысловасці. Прайшло ўжо нямала часу, калі закончылі сваю работу XV з'езд КП(б)Б і XVII з'езд ВКП(б). За гэты перыяд можна было дабіцца рашучага пералому ў выкананні плана выпуску харчовых прадуктаў і карэннага паляпшання іх якасці. Канферэнцыя на вырашэнні гэтых задач павінна сканцэнтраваць усю ўвагу.

Канферэнцыя павінна сур'ёзна, глыбока, з большэвіцкай дзелавітасцю выявіць вытворчыя недахопы, арганізацыйныя непаладкі ў рабоце.

Большэвіцкая крытыка і самакрытыка, не гледзячы на асобы, выпрыццё і барацьба з балбатнёй, парадасцю, апартуністычнымі ныццямі—вось якім павінен быць стыль работы канферэнцыі.

Як ідзе рэалізацыя звароту ЦК ВКП(б), як ідзе перабудова ўсёй работы на аснове рашэнняў XVII з'езда,—на гэта павінна даць выразны адказ канферэнцыя.

Работа фабрычна-заводскіх лабараторый, навукова-даследчых устаноў, пытанні сыравіннай базы, адшуканне новых відаў сыравіны — усе гэтыя пытанні павінны знайсці шырокі адбітак у рабоце канферэнцыі.

Канферэнцыя павінна высунуць новыя, больш жорсткія патрабаванні ў барацьбе за высокую, узорную прадукцыю харчовай прамысловасці. Не можа быць ніякага папушчэння тым гаспадарнікам, кіраўнікам пасобных звенняў харчовай вытворчасці, якія зводзяць барацьбу за высокую культуру на вытворчасці ТОЛЬКІ да ачысткі заводскіх двароў ад смецця, цахаў ад павуціння.

Сэнс звароту ЦК ВКП(б) заключаецца іменна ў тым, каб барацьба за ўкараненне жорсткага санітарна-гігіенічнага рэжыму, за высокую культуру на вытворчасці харчовых прадуктаў стала штодзённым метадам работы гаспадарнікаў, партыйных і профсаюзных арганізацый.

Прывіць майстру, рабочаму, работніцы, прыбіральшчыцы большэвіцкія навыкі абсалютнай чыстаты, выключнай патрабоўнасці да сябе і іншых у справе санітарыі, гігіены — гэта не адзінчасовая кампанія. Гэта работа патрабуе выхавання ў першую чаргу саміх кіраўнікоў прадпрыемстваў, рабочых у духу адказнасці кожнага кіраўніка, кожнага рабочага за выпуск добраякаснай прадукцыі. Барацьба за санітарыю, гігіену на харчовых прадпрыемствах ёсць барацьба за якасць. У гэтым напрамку асабліва вялікую цікавасць прадстаўляе ініцыятыву склікання ў Маскве гарадской канферэнцыі прыбіральшчыц прадпрыемстваў харчовай прамысловасці і грамадскага харчавання.

Барацьба за якасць прадукцыі не парыўна звязана з барацьбой за ўзняцце прадукцыйнасці працы (на 10,4 проц. у гэтым годзе), за зніжэнне сабекошту (на 3 проц.) у харчовай прамысловасці. Правільнае скарыстанне і расстаноўка рабочай сілы на аснове 6 умоў тав. СТАЛІНА, поўнае скарыстанне абсталявання, барацьба за жалезную дысцыпліну працы, за разгортванне комуністычных метадаў работы і павышэнне персанальнай адказнасці — рашаючыя фактары выканання плана.

Канферэнцыя павінна паслужыць магутным вагаром мабілізацыі мас на энергічную барацьбу за выпуск прадукцыі ўзорнай якасці, за ўкараненне высокай культуры на прадпрыемствах харчовай прамысловасці.

Поспехі залежаць ад нас і толькі ад нас. «Рэальнасць нашых планаў — гэта мы самі жывыя людзі».

Супроць рэкордсменства ў звышранняй сяўбе

Паасобныя раённыя арганізацыі пры правядзенні звышранцяй сяўбы зусім ігнаруюць агратэхніку, прыступаюць да звышранняй сяўбы там, дзе ўмовы для яе правядзення яшчэ не наступілі.

Па поводу паданых у «Звяздзе» і «Калгаснику Беларусі» фактах звышранняй сяўбы ў **Аршанскім** і **Чырвонапольскім** раёнах супрацоўніку «Белта» паведамілі ў Наркамземе наступнае:

Паводле інструкцый Наркамзема СССР і БССР звышранняя сяўба праводзіцца на зямлі, якая растала не менш чым на 12 сант., а таксама ў грязь, калі зямля растала поўнасцю. Для звышранняй сяўбы патрэбна каб снегавыя воды сцяклі з палёў.

Гэтыя ўмовы ні ў Чырвонапольскім, ні ў Аршанскім раёне яшчэ не наступілі, і таму такая «звышраняя» сяўба, якая праведзена ў Оршы, зусім правільна распэнена «Звяздой», як рэкордсменства, як сяўба, праведзеная без захавання элементарных правіл агратэхнікі па зусім непадрыхтаваных участках. Такое-ж прыблізна становішча і ў Чырвонапольскім раёне.

Іншае становішча ў паўднёвых раёнах, у прыватнасці ў Мазырскім і Ельскім, дзе глеба лёгкая, пясчаная, дзе ўзвышаныя месцы даўно вызваліліся ад снегу, дзе веснавыя воды сцяклі. Там пры захаванні ўсіх іншых аграправіл па асобныя ўчасткі зусім прыгодны для звышранняй сяўбы.

У сувязі з гэтым Наркамзем БССР накіраваў на месцы тэлеграму, у якой абавязвае раённыя земельныя арганізацыі пры правядзенні звышранняй сяўбы забяспечыць абавязковую прысутнасць агранамаў, для чаго павінны быць мабілізаваны ўсе агратэхнічныя сілы раёнаў і зямельныя навукова-даследчыя ўстановы.

Безумоўна забараняецца праводзіць звышраннюю сяўбу на непадрыхтаваных цяжкіх, заплываючых глебах. Катэгарычна забараняецца павялічваць план правядзення звышранняй сяўбы супроць зацверджанага для кожнага раёна.

Усе сілы, уся ўвага раённых арганізацый павінна быць звернута на падрыхтоўку да ранняй сяўбы і правядзенне яе ў максімальна кароткія тэрміны (БЕЛТА).

ЗАСЕЕМ ЗЯРНОМ ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ

МЕНСК, ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО

Мы, старыя майстры высокіх ураджаяў сацыялістычных палёў, лепшыя ўдарнікі калгасаў, інспектары па якасці, сабраўшыся па ініцыятыве палітаддзела Борнавіцкай МТС на сваю канферэнцыю, шлем вам, тав. ГІКАЛО, і ў вашай асобе ўсёй КП(б)Б палкае прывітанне.

Мы добра ведаем, што высокі ўраджай 1934 г. будзе залежаць ад якасці падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы, а таму ў адказ на пастанову ЦК КП(б)Б аб праверцы якасці насення, мы абавязваемся падрыхтаваць і засеяць сацыялістычныя палі зярном высокай якасці, на аснове разгортвання большэвіцкіх метадаў работы.

Мы бярэм на сябе абавязацельствы добра апрацаваць нашы сацыялістычныя палі, атрымаць ад іх яшчэ большы ўраджай, зрабіць нашы калгасы большэвіцкімі, а калгас нікаў заможнымі.

Запэўняем вас, тав. Гікало, што пад вашым кіраўніцтвам мы з гонарам выканаем гэтыя абавязацельствы.

ПРЭЗІДЫУМ ЗЛЁТА СТАРЫКОЎ КАЛГАСНІКАЎ БОРКАВІЦКАЙ МТС.

ЛЕПШЫ ВОПЫТ СТАРЫКОЎ-КАЛГАСНІКАЎ ВЫТВОРЧАСЦІ

Пісьмо старыкоў-калгаснікаў інспектароў па якасці калгасаў Боркавіцкай МТС да ўсіх калгаснікаў Дрысенскай, Полацкай і Ветрынскай МТС

Дарагія таварышы старыкі-калгаснікі!

Нам з вамі прышлося перажыць цяжкія гады памешчыцкай кабалы.

Вы яшчэ не забыліся, як было нам тады працаваць круглыя суткі на маленькім кавалку зямлі, каб пракарміць сябе і сваіх дзяцей.

Кепская зямля, апрацаваная прымітыўнымі прыладамі, не давала ўраджаю.

Горкі, прапітаны потам тады быў наш хлеб.

Зараз усё гэта канула ў вечнасць. Беднякі і сераднякі, старыя і маладыя, аб'ядналіся ў калгасы, каб на аснове сацыялістычных метадаў працы пры прымяненні навейшай тэхнікі добра апрацаваць зямлю і атрымаць як найбольшы ўраджай.

У нас за плячыма багаты шмат гадовы стаж практычнай работы на зямлі. Мы павінны гэту практыку прымяніць у нашай новай сацыялістычнай гаспадарцы. Мы разам з маладымі калгаснікамі павінны змагацца за якасную апрацоўку глебы, з тым, каб выканаць пастаўленую перад намі XVII з'ездам нашай партыі і любімым правадыром тав. **Сталіным** задачу дабіцца хуткага ўздыму і магутнага разбегу нашай сельскай гаспадаркі.

Каб ажыццявіць гэту задачу мы бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

Быць кожнаму з нас самым прыкладным ударнікам высокага ўраджаю і дабіцца, каб уся брыгада была перадавой.

Адказваць не толькі за сябе, але і за сваіх суседзяй па рабоце: сачыць, каб у брыгадзе не было ні бракаробаў, ні гультаёў, ні расхрадвальнікаў грамадскай уласнасці.

Наш галоўны абавязак — не дапускаць страт ураджаю і нядобраякаснай работы, заўсёды памятаючы, што дранная і недобрасумленная работа паніжае вартасць працадня.

Зараз асаблівую ўвагу ва ўсёй нашай рабоце трэба звярнуць на праверку і ачыстку насення і ў бліжэйшыя 3-4 дні правесці абмен нядобраякаснага насення. Да 25 сакавіка выканаць план вывазкі гною.

Штодзенна весці барацьбу за здаровае конскае пагалоўе, дабіцца, каб коні былі вышэй сярэдняй сытасці, для чаго зараз-жа паставіць слабых коняй па адпачынак.

Весці барацьбу за якасць догляду буйнай рагатай жывёлы, зберагчы ўвесь маладняк прыплоду 1934 года.

Дабіцца высокага ўраджаю, шляхам правядзення соцспаборніцтва на лепшую якасць палявых работ у час веснавой сяўбы, прымянення ўсіх правіл агратэхнікі.

Сабраўшыся на сваю канферэнцыю, мы выклікаем вас паследваць нашаму прыкладу і па-большэвіцку правесці веснавую сяўбу, памятаючы, што мы з'яўляемся актывістамі і дапаможнікамі палітаддзела ў барацьбе за большэвіцкія калгасы за заможнае, культурнае жыццё калгасніка.

Няхай жыве вялікі наш правадыр і настаўнік тав. Сталін!

ПРЭЗІДЫУМ ЗЛЕТУ.

У лабараторыі МТС

ФОТА-КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ А. МІКУЦКАГА.

Бабовыя культуры ў Сіроцінскім раёне дрэнна захоўваюцца. Ва многіх калгасах боб, гарох і віка зусім нізкай усхожасці.

На здымку: лабарант МТС правярае ўсхожасць гароху з калгаса Імя Чарвякова.

Пад суд ашуканцаў і жулікаў

У радзе калгасаў **ПАРЫЦКАГА** раёна па варварску адносяцца да коняй. У калгасе імя **Леніна, Коўшчыцкага** сельсовета, з-за няўважлівага догляду захварэў конь.

Брыгадзір **Бейшэн** пазваніў па тэлефону раённаму ветэрынарнаму доктару ў Парычы з просьбай прыехаць, або выслаць ветэрынарнага доктара для аказання дапамогі. Пры гэтым брыгадзір прапанаваў выслаць калгасную падводу. Ветэрынарны доктар заявіў, што ні ён, ні фельчар выехаць не могуць, прычым дадаў, што можа перадаць рэцэпт па тэлефону. Рэцэпт прыняў старшы конюх, але не запісаў. Ён наўгад прыгатаваў лякарства і даў каню. Пасля такой «дапамогі» конь звалёўся.

Яшчэ больш злачынныя адносіны да захавання конскага пагалоўя праявіў ветэрынарны інспектар **Мітраховіч.** Выехаўшы ў сельсоветы, як упаўнаважаны райкома, Мітраховіч на працягу аднаго дня зрабіў гастроль па калгасах «Чырвоны партызан», «Пролетарская перамога», імя Леніна і інш. Не зайшоўшы нават на канюшні, Мітраховіч склаў акты аб тым, што ў гэтых калгасах ўсё абстаіць добра і паехаў.

У сапраўднасці-ж у гэтых калгасах коні знаходзяцца ў самым агідным становішчы, заядаюцца вошамі. Коняй не лечаць: не ведаюць як. Збруя зусім не адрамантавана. Скрэбніц і шчотак няма, коняй ніколі не чысцяць. На канюшнях няма нават правіл догляду за канём.

Старшыня Бабруйскай міжраённай камісіі па ўраджайнасці.

ТАЛАЯЎ.

ЯК-НЕБУДЗЬ ВЫЦЯГНУЦЬ...

У Старадарожскім раёне ў калгасах яшчэ не засыпаны поўнасцю насенныя фонды. Насенне не ачышчана, і не ўсюды праверана на ўсхожасць. На кантрольны насенны пункт для праверкі ўсхожасці паступілі пробы толькі ад 55 калгасаў.

Праверка 150 аналізаў насення паказала, што насенныя фонды большасці калгасаў маюць зусім нязначны процант усхожасці.

Проса дае ўсяго 66 проц. прарастання, ячмень—44,4 проц., яравая пшаніца—31 проц., авёс — 23,5 проц.

Насеннем з такім процантам усхожасці безумоўна сеяць нельга. Інспадкладна трэба абмяняць.

У Старадарожскім раёне ў некаторых сельсоветах ёсць лішкі добраякаснага насеннага матэрыялу, якія трэба было-б ужо абмяняць. Аднак, раённае кіраўніцтва зусім аб гэтым не турбуецца. У райземаддзела на сёння яшчэ ніхто не ведае, наколькі калгасы і адпаведнікі забяспечаны насеннем. Загатчык райземаддзела мяркуе як-небудзь выдзягнуць з насеннем, але як выцягнуць—ён не ведае.

Агранам МГК **Жылінскі.**

РЭЙД СЕЛЬКОРАЎ

МАЗЫР. (Па тэлеграфу).

Мазырчына ўключылася ў рэйд друку па праверцы рашэнняў XVII партыйнага з'езда аб развіцці жывёлагадоўлі. У калгасах селькоры арганізуюць рэйдавыя брыгады. Насценная газета калгаса «**Новыя Манавічы**» правяла праверку работы малочнай і свінагадоўчай фермы. На скотным двары селькоры выявілі факты нядбайных адносін да гадоўлі маладняка. Газета ўзняла шэфства над цялятамі, свінаматкамі і слабымі коньмі. **М.**

НА ДАПАМОГУ ЧЭЛЮСКІНЦАМ

Паведамленне ўрадавай камісіі

Урадавай камісіяй атрымана радыёграма ад т. **Шмідта,** што ў лагеры чэлюскінцаў усё добра.

15-га сакавіка т. **Бабушкін** зноў прабаваў падрыхтаваць аэраплан к палёту, але не ўдалося дабіцца добрай работы матора пры марозе.

Атрыманы весткі ад т. Ляпідзеўскага аб яго палёце на «АНТ-4». Ён быў вымушан зрабіць пасадку з-за аварыі левага матора. Пасадка зроблена ў вогуле ўдачна за 6 міль на паўднёвы ўсход ад вострава Калючына.

Пры пасадцы пашкоджаны шасі і правая ферма. Экапіж здароў і цэл. Тав. Ляпідзеўскі 18-га сакавіка разам з старшынёй урадавай тройкі т. Петровым, які накіраваўся на яго пошукі, прыбыў у Ванкарэм. Заўтра т. Куканаў і тав. Ляпідзеўскі выяжджаюць к месцу аварыі самалёта для высвятлення магчымасцяй правядзення рамонту на месцы і дастаўкі туды матора, а таксама дастаўкі самалёта к вострову Калючыну. Тав. Ляпідзеўскі спадзяецца, што яму ўдасца ў хуткім часе вылецець на дапамогу чэлюскінцам.

Старшыня ўрадавай камісіі

В. КУЙБЫШЭЎ.

ДЫРЫЖАБЛІ У АРКТЫЦЫ

Гутарка з камандзірам стратастата „СССР" т. Пракоф'евым

Рашэнне ўрадавай камісіі аб уключэнні дырыжабляў у якасці рэзерва ў лік сродкаў дапамогі чэлюскінцам мае вельмі значныя падставы. Калі выключыць магчымасць неспрыяючых метэаралагічных умоў (снегапад, туман, шторм і інш.), ад якіх залежыць усякі лётны сродак, то іншых абставін, якія-б затрудняілі работу дырыжабляў у Арктыцы, няма.

Праўда, эксплаатацыя дырыжабляў «В-2» і «В-4», маючы на ўвазе іх аб'ём, будзе абмежавана ветравым рэжымам. Пры ветрах, якія перавышаюць 10-12 метраў у секунду, палёты затрудняльны, а ў некаторых выпадках і зусім могуць быць выключаны. Аднак, не трэба забываць і некаторых пераваг дырыжабляў. Пры пасадцы яны не залежаць ад спецыяльнага абсталявання і наяўнасці аэрадрома або пасадачнай пляцоўкі.

Дырыжабль лёгка садзіцца на ваду, і прыкладаў такіх пасадак дастаткова. Людзі, якія знаходзяцца ў лагеры Шмідта, і па колькасці і па арганізаванасці цалкам могуць замяніць стартавую каманду.

Трэба адзначыць і тую істотную акалічнасць, што ва ўмовах Арктыкі грузападёмнасць дырыжабляў узрастае і дырыжабль «В-4» зможа прыняць да 10-12 пасажыраў, а «В-2»—6-7.

Дырыжабль «В-2» можа быць скарыстан непасрэдна для палётаў у лагер Шмідта. Гэта забяспечваецца радыусам яго дзеяння. У такім выпадку дырыжабль «В-4» можа быць скарыстан для абслугоўвання патрэб усіх экспедыцый і, нарэшце, служыць хавальнікам газа для дырыжабля «В-2».

Экспедыцыя мае з сабой яшчэ і невялікія прывязныя аэрастаты. Будучы паднятымі ў паветра да тысячы метраў і больш, яны могуць з поспехам служыць сігнальнымі вышкамі. Гэта, несумненна, акажа вялікую ўслугу многім сродкам, якія працуюць па аказанню дапамогі чэлюскінцам.

Газавая ўстаноўка і запас хімікатаў для атрымання вадарода забяспечваюць работу экспедыцыі на працягу некалькіх месяцаў.

У заключэнне—аб людзях. Думаю, аб начальніку экспедыцыі т. Бірнбауме многа гаварыць лішне. Палёт стратастата «СССР» і работа т. Бірнбаума вядомы ўсім. Затым т. Опман. Гэта—стары вопытнейшы пілот. На пасту камандзіра дырыжабля заслугоўвае самых станоўчых водзываў. Зусім дастойны і тт. Гудаванцаў, Суслоў і Цамеранцаў ((БЕЛТА).

АБ ВЫЛІЧЭННІ ЗАРАБОТКА РАБОТНІКАЎ ПА КОЛЬКАСЦІ І ЯКАСЦІ ВЫПРАЦАВАНАЙ ІМІ ПРАДУКЦЫІ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР **пастанаўляюць:**

1. У выпадку невыканання работнікам устаноўленай для яго нормы выпрацоўкі па яго віне аплата працы праводзіцца па колькасці і якасці выпрацаванай ім прадукцыі без забеспячэння работніку якога-небудзь мінімальнага заработку.

Калі-ж невыкананне нормы здарылася не па віне работніка, то работнік ва ўсякім выпадку павінен атрымаць не менш двух трэцей сваёй тарыфнай стаўкі.

ЗАЎВАГА: Пры невыкананні нормы ў рэзультаце прастою або браку аплата працы рэгулюецца пастановай ЦВК і СНК СССР ад 30 снежня 1931 г. аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню аплаты прастою і браку на вытворчасці і транспарце. (З. з. СССР. 1932 г. № 2, арт. 11 і № 22 арт. 144).

2. У выпадку сістэматычнага невыканання работнікам устаноўленай нормы ў нармальных умовах работы работнік можа быць зволен або пераведзен на іншую работу.

3. Урадам саюзных рэспублік прапануецца прывесці кодэксы законаў аб працы ў адпаведнасць з даданай пастановай.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР **М. КАЛІНІН.**

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР **В. МОЛАТАЎ.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР **А. ЕНУКІДЗЕ.**

МАСКВА, Крэмль 17 сакавіка 1934 г.

УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД МОПР

МАСКВА, 19 (БЕЛТА).

18-га сакавіка ў гадавіну Парыжскай Комуны ў Маскве адкрыўся чацвёрты ўсесаюзны з'езд МОПР.

У ганаровы прэзідыум аднагалосна выбіраюцца члены і кандыдаты палітбюро ЦК ВКП(б), а таксама т. т. **Мануільскі, Пятніцкі, Кусінен, Марці, Эрколі, Гекерт, Ланскі, Ван Мін, Полліт, Дзімітраў, Папоў, Танеў, Тэльман, Том Муні** і рэволюцыйныя вязні капіталістычных краін. Пры ўпамінанні імя правадыра партыі і міжнароднага пролетарыята тав. **Сталіна** далегаты ўстаюць і наладжваюць доўгую бурную авацыю.

У дзелавым прэзідыуме т.т. **Жданаў, Стэцкі, Кнорын, Швернік, Шор, Джэрманото, Стасава і іншыя.**

З'езд адкрыла нам. старшыні выканкома МОПР тав. **Стасава.**

З вялікім дакладам аб міжнародным становішчы выступіў тав. **Кнорын.**

З'езд вітаў піонерскі атрад Масквы. Атрыманы шматлікія прывітанні з усіх канцоў свята — ад ЦК чырвонай дапамогі Кітая, «Юманітэ», Андрэ Марці, Марселя Кашэна і ад палітычных зняволеных адной з італьянскіх турмаў.

З'езд паслаў т.т. Сталіну, Кагановічу, Комінтэрну, а таксама Дзімітраву, Папову і Таневу прывітанні.

Прынят зварот да рэволюцыйных вязняў капіталістычных краін і прывітанне гераічнаму аўстрыйскаму пролетарыяту.

СУРОВА КАРАЦЬ ЗНІШЧАЛЬНІКАЎ ЖЫВЁЛЫ

„СПРАВУ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ ПАВІННЫ УЗЯЦЬ У СВАЕ РУКІ УСЯ ПАРТЫЯ, УСЕ НАШЫ РАБОТНІКІ, ПАРТЫЙНЫЯ І БЕСПАРТЫЙНЫЯ“ (СТАЛІН)

УЗМАЦНІЦЬ КІРАЎНІЦТВА ПАРТГРУПАМІ

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта)

Рэалізуючы рашэнні XVII з'езда партыі, партыйная арганізацыя ранчошнай фабрыкі імя **Клары Цэткін** карэнным чынам перабудоўвае сваю работу.

Замест былога «прадстаўніцтва» створан камітэт, у які ўваходзяць: сакратар парткома тав. **Мірноў**, партарганізатары швэйнага цэльнага і матальнага цэха тт. **Магідава** і **Блажэвіч**, брыгадзір вязальнага цэха тав. **Камінская** і старшыня фабкома т. **Бараноўская**.

Каб лепш забяспечыць партыйнае кіраўніцтва, на ўсіх участках створана 12 партыйных груп на але з групавымі партарганізатарамі.

У асноўных цэхах — вязальным, швэйна-кецельным і матальным вылучаны цэхавыя партаргані затары.

Так перабудавана структура партарганізацыі фабрыкі.

—Глядзіш і дзівішся, — адкуль толькі для ўсяго хапае часу, — гаворыць сакратар парткома Смірноў, — толькі цяпер пераконваеш ся, колькі каштоўнага часу траціцца на складанне парадку дня да пасяджання бюро і на пісанне доўгіх рэзалюцый і пастаноў. Цяпер увесь гэты час скарыстоўваеш выключна на аператыўнае кіраўніцтва цэху, на ўчастку.

Участак сартавання ў швэйна-кецельным цэху аказаўся самым вузкім месцам на фабрыцы. Уведзены новы асартымент асвойваўся вельмі марудна. Нормы выпрацоўкі не выконваліся. Замест 80 дзесяткаў работніца давала самае большае— 50 дзесяткаў панчох.

Разам з цэхавым партарганізатарам тав. **Магідавай**, Смірноў вывучыў прычыны прарыву і прышоў к высновах, што комуністы гэтага ўчастка не заўсёды ў авангардзе, што адсутнасць брыгаднай сістэмы работы адмоўна адбіваецца на выкананні промфінплана. Гэта пытанне было неадкладна абгаворана ўсёй парткрупай участка. Жорсткай большэвіцкай крытыцы былі падвергнуты ўсе комуністы, якія не апраўдвалі звання комуніста на вытворчасці. У рэзультаце, пасля прыняцця адміністрацыяй практычных указанняў і прапаноў партгрупы, узвяцца авангардная ролі комуністаў на вытворчасці, участак сартавання вышаў з прарыву і цяпер выконвае сваю штодзенную праграму на 100-110 проц.

Такое-ж становішча было і на ўчастку штопкі.

Пераштопка (брак) на гэтым участку даходзіла штодзенна да 70-80 дзесяткаў панчох. Па прапанове Смірнова гэта пытанне было таксама пастаўлена на абгаворэнне партгрупы. Былі арганізаваны спецыяльныя ўдарныя брыгады на чале з комуністамі - брыгадзірамі і зараз пераштопка даведзена да 9-8 дзесяткаў.

Тав. Смірноў практыкуе штодзенныя 10-мінутныя аператыўныя нарады цэхавых партарганізатараў. Коратка і выразна партарганізатары інфармуюць аб становішчы цэха і атрымліваюць ад сакратара парткома неабходныя дзелавыя указанні.

Нядаўна тав. Смірноў правёў з цэхавымі партарганізатарамі нараду, на якой абгаварвалася пытанне аб падрыхтоўцы цэхавых партсходаў, прысвечаных праверцы выканання ўзятых на сябе ў адказ на даклад тав. Сталіна XVII з'езду партыі абавязкаў.

Атрыманая партарганізатарамі ўстаноўка на нарадзе забяспечыла добрае правядзенне гэтай праверкі на партсходах, потым і ў гушчы рабочай масы. Высветлілася, што самаабавязацельствы як комуністамі, так і беспартыйнымі рабочымі выкананы. Так, брыгады т. Скраган поўнасцю выканала ўзятае на сябе абавязацельства — дадаткова звыш плана выпускаць 12 дзесяткаў панчох.

На адным з пасяджэнняў парткома было спецыяльна пастаўлена пытанне ўпчыльнення працоўнага дня.

Што прымусіла т. Смірнова паставіць гэта пытанне на пасяджэнні парткома?

— Я, — гаворыць тав. Смірноў, — знаходзячыся ў цэху, на ўчастку і на паасобных працэсах, пераканаўся, што на радзе ўчасткаў каштоўны працоўны час у нас не дапушчальна транжыруецца. Спачатку па дагаворанасці з фабрычнай адміністрацыяй, ТНБ было даручана правесці фатаграфію рабочага часу. Пасля гэта пытанне было перанесена на пасяджэнне парткома з удзелам цэхавых партарганізатараў.

Фатаграфія працоўнага часу паказала, што ў швэйна-кецельным цэху работніцы **Дукар і Казанс** загружаюць свой працоўны час на 92 проц., **Сэкалава**—на 80 проц., а майстар па кецелеўцы — на 23 проц. Тое-ж было і ў вязальным цэху. Тут працоўны час работніцы **Мельнікавай** быў загружан усяго толькі на 56 проц.

Па пасяджэнні парткома мы вынеслі кароткую, але выразную, вызначную дзелавую пастанову. Пытанне аб упчыльненні працоўнага дня было ўзнята на прынцыповапалітычную вышыню, былі даны выразныя ўказанні аб стопроцантнай карыснай загрузкі рабочага часу.

Зараз на фабрыцы праводзіцца вялікая работа па прапрацоўцы рашэнняў XVII з'езда партыі.

Па сённешні дзень матэрыялы з'езда прапрацоўваліся ў 60-ці рабочых сем'ях. 14 сакавіка даклад т. Молатава прапрацоўваўся на дому, у работніцы т. **Драпкінай**. На прапрацоўку прышло звыш 30 работніц.

У партыйнага кіраўніцтва выпаў адзін з важнейшых участкаў фабрыкі — трыкатажнае аддзяленне. І таму на светлым фоне работы ўсёй фабрыкі (промфінплан фабрыкай за студзень і люты выкананы на 102,5 проц.) работа гэтага ўчастка безумоўна з'яўляецца чорнай плямай (план па трыкатажнаму аддзяленню выконваецца на 85-87 проц.).

Слабая работа групавых партарганізатараў. Партарганізатары партакомам не інструктуюцца, таму яны ў большасці сваёй з'яўляюцца бездапаможнымі, не праяўляюць уласнай ініцыятывы.

З такім становішчам мірыцца нельга. Партыйны камітэт павінен памагчы групавым партарганізатарам у іх рабоце, узмацніць свае кіраўніцтва імі. Без умацавання нізавога партзвяна, якім з'яўляецца групавы партарганізатар, немыслима перабудова работы партарганізацыі.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

ЖЫВЁЛА ЗНІШЧАЕЦЦА НА ВАЧАХ РАЙКОМА

(Ад карэспандэнтаў «Правды»)

У горадзе **Дуброўна** і ў мястэчку **Меды**, Дубровенскага раёна, Беларускай ССР, — два базарныя дні ў тыдзень. Кожны базар — гэта агромадная бойня. Забіваецца некалькі сот галоў жывёлы. У адной Дуброўне — не менш 700-800 галоў у адзін базарны дзень.

Разрубачныя ларкі горсовета і гарадскога таварыства спажыўцоў працуюць на процантах. Загадчыкі крамамі спекулянты і лішэнцы **Булак і Фелер** прыкладаюць усе сілы, каб атрымаць і забіць як ма га больш жывёлы. Ад іх не адстаюць спекулянты **Кунак і Гурвіч**, якія адпраўляюць мяса ў іншыя гарады.

Кулакі і падкулачнікі дзейнічаюць адкрыта. Зняты з работы за развал калгаса «Новае жыццё» **Сяргей Казак** вядзе агітацыю за ўбой маладняка. У калгасе **«Іскра»**, Баеўскага сельсовета, пад кіраўніцтвам кулакоў пачалося, масавае знішчэнне цялят.

Шныруюць па калгасах тыя-ж Булак і Фелер, агітуючы за забой жывёлы. У мястэчку Лядах працуе бойня спекулянта **Печнікава**. Ветдоктар **Гутараў** бесперашкодна дае дазвол на забой жывёлы, паведамляючы аб колькасці дазволаў Булаку і Фелеру.

Ужо знішчана вялікая колькасць коняй, кароў, свіней і авечак. Раённая жывёлагадоўчая арганізацыя склала план аднаўлення жывёлы на 1934 год такім чынам, што ён заахвочвае знішчэнне жывёлы. Горсовет атрымлівае палову выручкі ларкоў і таксама нічога не заўважвае. Сакратар райкома тав. **Кацман** і яго намеснік тав. **Вашкевіч** тлумачаць знішчэн не жывёлы недахватам кармоў. У той-жа час на базарах стаяць дзесяткі вазоў добрага сена і тут-жа прадаюць авёс, ячмень, салому.

Сакратар райкома тав. Кацман і старшыня раённага выканкома тав. **Сямашка** падпісаў нямала рэзалюцый аб павелічэнні пасалоў жывёлы, а на справе патураюць контрэволюцыйную дзейнасць ворагаў калгасаў.

Ф. ВІГДАРОВІЧ і І. ЛУК'ЯНОВІЧ.

АД РЭДАКЦЫІ:

«Правда» спадзяецца, што ЦК і СНК Беларусі тэрмінова расследуюць факты, паведамляемыя нашымі карэспандэнтамі і ліквідуюць гэтыя агіднасці. («ПРАВДА»).

Сакавік—рашаючы месяц ліквідацыі бескароўнасці

Адказнейшае заданне партыі і ўрада — ліквідацыя бескароўнасці сярод калгаснікаў—зрываецца. Толькі 50 проц. бескароўных калгаснікаў БССР надзелены цёлкамі. Кіраўніцтва раду раёнаў (ТЕРЭХОЎСКАГА, НАРАЎЛЯНСКАГА, ТАЛАЧЫНСКАГА, ГОРАЦКАГА, ЛОЕЎСКАГА і інш.) зразумела гэта адказнейшае мерапрыемства партыі і ўрада як чарговую кампанію. Апошнія дэкады не даюць амаль ніякага зруху ў надзяленні цёлкамі бескароўных калгаснікаў. А між тым зараз, у перыяд масавых ацёлаў, мы маем усе ўмовы, каб поўнасцю ліквідаваць бескароўнасць.

Дзяржава аказала вялікую грашовую дапамогу калгаснікам для набыцця цёлак. Але гэтыя сродкі скарыстаны толькі на 67 проц., прычым значная частка сродкаў скарыстоўваецца калгасамі не па прамому прызначэнню.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР сурова папярэдзілі партыйныя і совецкія арганізацыі, што партыя і ўрад не будуць ліберальнічаць са зрыўшчыкамі гэтага важнейшага мерапрыемства, са зрыўшчыкамі барацьбы за заможнае калгаснае жыццё, за разгортванне жывёлагадоўлі.

Надзяленне бескароўных калгаснікаў цёлкамі з'яўляецца неадпучнай часткай барацьбы за разгортванне жывёлагадоўлі. У святле рашэнняў XVII партыйнага з'езда гэта мерапрыемства набывае выключнае значэнне. Гэта павінны памятаць усе раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі. Занясенне раду раёнаў на чорную дошку з'яўляецца суровым папярэджаннем для ўсіх раёнаў, якія яшчэ не закончылі надзяленне бескароўных калгаснікаў цёлкамі.

Партыя і ўрад будуць прыцягваць да суровай адказнасці ўсіх, хто кан крэтную дапамогу калгаснікам па ліквідацыі бескароўнасці падыняе пустой балбатнёй.

ЧОРНАЯ ДОШКА

ЗА ЗРЫЎ НАДЗЯЛЕННЯ БЕСКАРОЎНЫХ КАЛГАСНІКАЎ ЦЁЛКАМІ ЗАНОСЯЦЦА НА ЧОРНУЮ ДОШКУ НАСТУПНЫЯ РАЁНЫ:

ТЕРЭХОЎСКІ, ВЫКАНАЎ ЗАДАННЕ НА 17 ПРОЦ.
НАРАЎЛЯНСКІ ВЫКАНАЎ ЗАДАННЕ НА 17,2 ПРОЦ.
ТАЛАЧЫНСКІ ВЫКАНАЎ ЗАДАННЕ НА 29,5 ПРОЦ.
ГОРАЦКІ ВЫКАНАЎ ЗАДАННЕ НА 30,4 ПРОЦ.
ЛОЕЎСКІ ВЫКАНАЎ ЗАДАННЕ НА 32,7 ПРОЦ.

УРОКІ КАСЦЮКОВІЦКАЙ СПРАВЫ

У поўнач старшыня вызной сесіі Вярхоўнага суда заявіў, што прыгавар будзе абвешчан у тры гадзіны ночы. Суд удаліўся на абмеркаванне прыгавару. Але перапоўненая зала, наэлектрызаваная прамовамі грамадскага абвінавачання, пракурора і абароны, нават і не збіралася ісці спаць. Ва ўсіх кутках жвава абгаварваюцца прыведзеныя факты, доказы...

У Касцюковіцкім раёне за 6 месяцаў вырэзалі 25.000 галоў жывёлы. У Касцюковічах ні перад чым не спыняліся, шырока прымяняліся «очковтирательство», ашуканскія акты, шкодніцкае планаванне арганізацый ферм і т. д.

Калі ў Касцюковічах не было шкодніцкай арганізацыі па знішчэнню жывёлы, то ўся сістэма кіраўніцтва гэтай справай спрыяла таму, каб кулацкі нож сваволіў у аборах, цялятніках, свінарніках.

Загадчык земаддзела ПАЎЛЮЧЭНКА злачынна сабатаваў усе сігналы друку па гэтаму пытанню. Не звяртаў ён увагі і на той факт, што касцюковіцкі рынак аж стагнаў ад мноства цялят, кароў, свіней. Пасылаючы зводкі ў Менск, ён аб гэтым утойваў.

7 студзеня Паўлючэнка атрымаў ад заг. наргасуліку весткі, што папярэднія выніки пераучоту пагалоўя даюць па раду сельсоветаў катастрафічнае змяншэнне. Тым не менш 13 студзеня Паўлючэнка выступае на райпартканферэнцыі з дакладам аб абсалютным росце пагалоўя.

Не абмежаваўшыся роляю «очковтирателя», Паўлючэнка пачаў проста ашукваць дяржаву, прадставіўшы некалькім дзесяткам ферм скідкі на малако і мяса без усякіх падстаў.

ТАРАНАЎ — раённы зоатэхнік, які карыстаўся асаблівым давер'ем Паўлючэнкі, быў жулікам і вымагацелем. Прыехаўшы ў калгас «СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», ён патрабаваў масла, мяса, мукі ў абмен на тое, што ён не раскажа, што пры абмапоце дзесяткі цэнтнераў зярна ідуць у салому. Гэты кулацкі агент сарваў зоатэхнімінум на фермах раёна, адмаўляўся аказваць фермам усякую дапамогу, а калі бывала прыязджаў у калгас, то толькі для таго, каб толькі дзе нажыць кавалак мяса, масла.

БЫЧКОЎ — старшыня калгаса «Совецкая Беларусь», які за паўгода знішчыў 500 галоў жывёлы і спасылаўся на судзе на 500 актаў — тыповы кулацкі агент, пралезшы ў партыю са здрадніцкімі мэтамі.

— Бычкоў з'яўляецца социяльна-небяспечным элементам для калгаснага ладу, — так заявілі ў адзін голас выступаўшыя сведкі з калгаса «Совецкая Беларусь». Усе яны характарызавалі Бычкова, як дзяржыморду.

Ужо тры гадзіны ночы. Але насця рожанасць залы не сціхае. Ля будынка нардома поўна фурманак з бліжэйшых калгасаў. Урэшце старшыня суда т. АБРАМАЎ пачынае чытаць прыгавар.

Прыгавар поўнасцю ўстанаўляе праўдзівасць сігналаў друку аб масавым знішчэнні жывёлы і адказнасць падсудных за гэту справу; прыгавар кваліфікуе сістэму кіраўніцтва актамі замест арганізацыйнай работы, шкодніцкае стварэнне міфічных ферм замест абслугоўвання аграмаджанага пагалоўя...

Прыгавар адзначае, што гэтым судом наносіцца рашучы ўдар старой сістэмы кіраўніцтва жывёлагадоўлі, асуджанай XVII з'ездам ВКП(б) і што ў гэтым сэнсе прыгавар з'яўляецца суровым папярэджаннем для ўсіх райземаддзелаў і РВК.

Л. КАПЛАН.

АБ ЗАМЕТКАХ У ГАЗЕЦЕ „СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЕ ЗЕМЛЕДЕЛИЕ“

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

1. Лічыць, што заметкі ў «Социалистическом земледелии» (за 24 і 27 лютага і 1 сакавіка 1934 года) зусім правільна паставілі пытанне аб недапушчальных адносінах да справы жывёлагадоўлі з боку кіраўніцтва Касцюковіцкага раёна (РК, РВК), ускрыўшы фактыты злачынага разбазарвання жывёлы, асабліва маладняка, у радзе калгасаў і з боку аднаасобнікаў.

Гэтыя факты, змешчаныя ў «Социалистическом земледелии», сведчаць аб тым, што ўказанні і пастановы партыі і ўрада па пытанню аб барацьбе з разбазарваннем жывёлы, мерапрыемствы па захаванню і аднаўленню жывёлагадоўлі касцюковіцкімі як раённымі, так і сельскімі калгаснымі арганізацыямі не праводзяцца, па сутнасці ігнаруюцца, што лішні раз сведчыць аб галаслоўных, славесці ігнаруюцца, што лішні раз сведчыць аб галаслоўных, славесна-дэкларацыйных адносінах да важнейшых рашэнняў партыі і ўрада і адсутнасці на справе барацьбы з фактамі прамога кулацкага знішчэння жывёлы.

2. Партыйная арганізацыя раёна своечасова не зрабіла практычнага і палітычнага выводу з мёртвых месца ў раёне фактаў масавага забою маладняка, якія з'яўляюцца па сутнасці справы работай класавага ворага і рэзультатам страты рэволюцыйнай пільнасці да дзеянняў класавага ворага з боку паасобных членаў партыі і некаторых партыйных і совецкіх арганізацый. У прыватнасці, сакратар РК тав. **Кузьмін** не зразумеў, што нельга абмяжоўвацца агульнымі «разгорнутымі» рашэннямі, а трэба быстра мабілізаваць усю масу як членаў партыі, так і беспартыйных на барацьбу з канкрэтна выяўленымі фактамі знішчэння жывёлы. Старшыня РВК тав. Градштэйн, будучы членам ячэйкі калгаса «Парыжская комуна», дзе амаль поўнасцю знішчан ацёл 1933 года, не ўскрыў гэтых фактаў, што сведчыць, што тав. Градштэйн фармальна, не па-большэвіцку адносіцца да сваёй работы ў сваёй ячэйцы і да сваіх абавязкаў старшыні РВК.

Абмежаванца ў адносінах сакратара РК тав. Кузьміна вынясенням вымовы, маючы на ўвазе, што тав. Кузьмін працуе ў раёне недаўна і неадкладна пасля выяўлення заметак у «Социалистическом земледелии» разгарнуў у раёне сур'ёзную работу па жывёлагадоўлі, канкрэтна прыняўшы меры па фактах як паведамленых у «Социалистическом земледелии», так і выяўленых у далейшым, прыняўшы неабходныя меры ў адносінах да вінаватых.

Тав. Градштэйна, як неапраўдаўшага сябе ў якасці старшыні РВК, тым больш, што тав. Градштэйн у раёне працаваў больш года ў якасці старшыні РКК — у перыяд найбольшага знішчэння жывёлы і за ўвесь гэты перыяд работы не ўскрыў фактаў забою жывёлы,— з работы старшыні РВК зняць з пераводам на нізавую работу.

3. Пытанне аб канкрэтных вінаватых у разбазарванні жывёлы ў раёне і аб неабходных мерапрыемствах па гэтаму пытанню заслухаць на бюро пасля судовага разгляду.

4. Абвясціць суровую вымову тав. Стрэле за тое, што на выступіўшых у Наркамзем непасрэдна тав. Стрэле ад цэлага раду раённых фактах, аналагічных мёртвым месца ў Касцюковіцкім раёне, тав. Стрэле не прыняў неабходных мер па гэтых канкрэтных фактах, паведамленым у Наркамзем, і не далажыў аб іх у ЦК.

Даручыць тав. Бенеку прыняць усе меры ў адносінах да жывёлагадоўчага аб'яднання Наркамзема, забяспечваючыя недапушчэнне ў далейшым падобнага роду памылак.

5. Прапанаваць РК шырока прапрацаваць у арганізацыі гэту пастанову ЦК з тым, каб на аснове разгорнутай крытыкі і самакрытыкі прарываў, недахопаў у рабоце ў кожнай ячэйцы, калгасе, былі намечаны і праведзены практычныя меры па далейшаму прыцягненню вінаватых у забоі маладняка да адказнасці і ў далейшым не толькі не дапускаць забою, а дабіцца павелічэння пагалоўя як буйнай, так і дробнай жывёлы.

6. Лічыць неабходным па скапчэнні веснавой пасеўнай кампаніі зноў заслухаць на бюро ЦК кіраўніцтва Касцюковіцкага раёна па пытанню аб жывёлагадоўлі ў раёне і аб рэзультатах праведзенай работы.

7. На наступным пасяджэнні бюро заслухаць паведамленне 2-3 раёнаў па аналагічных фактах.

8. ЦК указвае ўсім РК і РВК, што становішча з пытаннем жывёлагадоўлі, ускрытае ў Касцюковіцкім раёне, указвае на неабходнасць сур'ёзнага разгортвання ўсёй работы па жывёлагадоўлі і ў асаблівасці рашучай барацьбы супроць забою маладняка ва ўсіх раёнах БССР. Неадкладнае разгортванне гэтай работы тым больш патрабуецца, што з раду раёнаў (Горкі, Мсціслаўль, Орша, Дуброўна, Клімавічы, Ветка і т. д.) таксама паступаюць факты аб масавым разбазарванні і забоі жывёлы.

ЦК папярэджвае РК і РВК, што ў выпадку выяўлення фактаў, падобных да ўскрытых у Касцюковічах, хоць-бы на асобных сельсоветах, будуць прыняты самыя суровыя меры пакарання як па лініі партыйнай, так і па лініі судовых органаў.

9. Заметкі аб Касцюковіцкім раёне ў «Соц. земледелии», рашэнне РК па гэтых заметках, судовы прыгавор і гэту пастанову выдаць асобнай брашурай і разаслаць усім раёнам.

Кантроль за выкананнем гэтай пастановы даручыць сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б.

Акад. С. Я. Вальфсон

„РАСАВАЯ НАВУКА“ НА СЛУЖБЕ ФАШЫЗМА

I.

Буржуазная навука ў мэтах тэарытычнага падтрымання капіталістычнага ладу даўно прабавала «натуралізаваць» грамадскі працэс. Падобнага роду спробы зводзяцца да падпарадкавання прыроды і грамадства адным і тым-жа законам і зацямнення такім шляхам факта расколу грамадства на смяротна-варожыя клясы. Але буржуазія ніколі, можа быць, не рабіла яшчэ такіх суда-ражных спроб зацямніць клясавы падзел грамадства і ролю класавай барацьбы, як у сучасны момант, калі свет знаходзіцца на парозе другога туру войн і рэволюцый. І таму вусім заканамерна, што яна іменна цяпер з такой неабузданасцю «натуралізуе» ўсе з'явы грамадскага жыцця. Ідэолагі загніваючага капіталізма літаральна расшыбаюць лбы, стараючыся даказаць, што ключ да разумення ўсяго, што адбываецца ў прыродзе і грамадстве, дае біалогія, што «марксісцкаму, социялагічнаму міфу» класа і класавай барацьбы проціпаставіць непахісная біялагічнае адзінства сям'і і расы.

Галоўнай задачай, якую рашаюць сучасныя «натуралізатары» грамадскага працэса, з'яўляецца процідастаўленне марксісцкай тэорыі клясавай барацьбы тэзіса аб біялагічнай яяроўнацэннасці асобных груп і слаёў чалавецтва. Мадэрнізуючы і «пагльбляючы» доказы, якія развівалі Вольтман, угрунтоўваючы сваю «палітычную антрапологію», і Шальмайер — сваю «нацыянальную біалогію», — іх фашыствуючыя пераемнікі (Гюнтэр, Ленц, Шайрэр і інш.) даказваюць, што біялагічная няроўнацэннасць асобных груп насельніцтва з'яўляецца адпраўным пунктам для разумення ўсяго гістарычнага працэса. Прыкрываючыся плашчом вучонай фразеалогіі, яны развіваюць тую філасофію грамадскага жыцця, якую без лішніх акалічнасцяй вылажыў у сваім вядомым мемарандуме «Задачы Японіі ў эпоху Сіова» правадыр японскага ваенна-фашыцкага руху генерал Араакі.

У гэтым цікавым дакуменце правадыр японскіх фашыстаў апалчаецца супроць «памылковай філасофіі аб адсутнасці рознасцяй», якой прысвячае цэлы раздзел свайго мемарандума.

На самой справе: «...няма нічога існуючага ў космасе, што не мела-б сваёй мэты: і ў сонца, і ў месяца, і ў бялізкіх зор, і ў земнага шара — ва ўсіх ёсць пэўная мэта. Гэта-ж можна сказаць і аб нашым свеце: як у чалавека ёсць характэрныя для яго чалавечыя ўласцівасці і асаблівасці, так і кожная жывёла, кожная расліна мае свае ўласцівасці. Толькі там, дзе ёсць розніца, стварэнца вартасць... Лягавая і пудэль — сабакі. Але-ж існуе вялікая розніца паміж імі... Тое-ж самае мы маем і ў свеце чалавека. Калі тут не існуе вялікай розніцы паміж людзьмі ў адносінах знадворнага выгляду, то ўсё-ж існуюць рознасці, якія акрэсліваюцца расавай прыналежнасцю і нацыянальнасцю. У нас, у японцаў, ёсць свае ўласцівасці і свая мэта, а ў кітайцаў свае асаблівасці... Ідэя аб адсутнасці розніцы не можа быць намі прызнана».

Адным словам, мудрая святая мэтазгоднасць, апяная яшчэ Генрыхам Гейне: створаны быкі для таго, каб рабіць з іх бульён, створаны аслы для таго, каб нагружаць іх цяжарам і створаны людзі для таго, каб есці бульён і не быць падобнымі да аслоў... Пад прыкрыццём такой філасофіі лагчэй «маючым свае ўласцівасці» японцам захватваць і грабіць кітайскія землі, а маючым «свае асаблівасці» кітайцам прымірацца са сваім лёсам... З гэтай філасофіяй зусім згодна і родная Садао Араакі душа Альфрэда Розенберга: «Мы ва дзем наступленне на светапогляд ліберала таксама, як і на марксістаў. Для нас душа няроўна душы, чалавек няровен чалавеку. Наша мэта — моцны германскі чалавек».

У апраўданне розенбергаўска-араакісцкай «філасофіі няроўнацэннасці» вядуць наступленне на навуковаму фронту сотні фашыствуючых біолагаў, соцыёлагаў, медыкаў, філосафаў, этнографаў расісцкага толку... Яны пішуць «фундаментальныя» манаграфіі, абстаўленыя ўсёй падабаючай такім выпадкам акадэмічнай апаратурай, багата забяспечаныя імяннымі і прадметнымі ўказальнікамі, з усёй пераканаўчасцю даказваючыя, што розніца паміж чалавекам адной расы і другой пераважае розніцу паміж чалавекам і жывёлай, што існуюць расы поўнацэнныя ары стакратаў і існуюць расы «недачала векаў», што ўся гісторыя чалавецтва вызначаецца ўзаемадносінамі «спермы і крыві», што пануюць тыя, каму гэта прызначана іх «вышэйшымі ўласцівасцямі» і законам социяльнага адбору, а другія пакутуюць, гінуць і выміраюць з голаду ў строгай адпаведнасці са сваімі «натуральнымі ўласцівасцямі», са сваёй біялагічнай і іншай няроўнацэннасцю.

Так ствараецца тое, што на мове фашысцкіх тэарэтыкаў горда завецца «біялагічным светапоглядам».

Прыхільнікамі «біялагічнага светапогляду» пускаецца ў абарот тэорыйка аб тым, што сучасны крызіс з'яўляецца рэзультатам злачыннага процідзеяння социяльнаму адбору, якое выражаецца ў клопатах грамадства аб невылечна-хворых, дэфектыўных, інвалідах і іншых «няпоўнацэнных» элементах. Масам, пакутуючым пад ярмом эксплуатацыі, галечы і беспрацоўя, выбітым з каляіны чалавечага існавання, дэкласуемым дробным буржуа, людзям, ператвараемым ў паўпераў, дэмагагічна «растлумачваюць», што ўсе іх бядоты абумоўлены «супрацьнатуральнымі» клопатамі аб адкідах людскога роду, аб усіх гэтых калеках і інвалідах і іншым «чалавечым баласце», які асуджан на пагібель жалезнымі законамі социяльнага адбору. Газетныя полосы і старонкі тоўстых журналаў пакрываюцца крыклівымі дыяграмамі, статыстычнымі зводкамі, абурнымі артыкуламі, даказваючымі, колькі «народных сродкаў» непрадуктыўна і злачынна траціцца на захаванне жыцця і выхаванне тых, хто павінен загінуць па непахісных законах социяльнага адбору. Так працуе буржуазія «пераключыць» ужо стаючае абурэнне мас демагагічным адцягненнем іх у бок ад сапраўдных вінаўнікаў іх бядот.

Воссю вярчэння ўсяго біялагічнага светапогляду з'яўляецца, як вядома, раса. Метафізічна знаменная, разважаўсёды даная заалагічная агульнасць расы, якая базуецца на спалучэнні «крыві і характара», абвяшчаецца фашысцкімі тэарэтыкамі асноўным рухавіком усяго грамадскага жыцця. Гістарычны працэс прадстаўляе ў іх вачах нішто іншае, як рэзультат паўных узаемадносін і ўзаемасутычак рас. Сукупнасць уласцівасцяй расы і складае яе душу.

Абвяшчаючы расавую душу «священнымі умясціліішчам таемных улас цівасцяй чалавечай народы і ўсю гі сторыю рэзультатам прыцяжэння і адштурхоўвання рас, тэарэтыкі расізма з усёй энергіяй, на якую толькі здольны канкуруючыя паміж сабой нацыяналістычныя буржуа, спаборнічаюць адзін з другім за першынства «сваёй» расы, за яе вышэйшыя ўласцівасці, за яе «прыродныя перавагі» ў адносінах да ўсіх другіх рас. **Паняцце расы становіцца галоўнай зброяй ваяўнічага нацыяналізма сучаснай буржуазіі.**

Вось, як, напрыклад, маляўнічна апісвае правадыр германскіх расавікоў прыродныя доблесці паўночнай расы: «Уласцівасцю паўночнай душы з'яўляецца спакойны погляд, мэтаімкнёны спакой, рашучасць дзеяняў... Кроў паўночнага чалавека налажыла неатдзяльны адбітак на ўсю гісторыю чалавецтва. Гэта кроў патрабуе выканання асобых задач. Чым больш дана паўночнаму чалавеку, тым больш з яго спагоніцца. Паўночная кроў абавязвае»... (праф. Ганс Гюнтэр. Паўночная ідэя).

Выходзячы з падобнага роду «ўстановак», даваемых тэарытычнымі правадырамі расізма, расісцкія папулярызатары даводзяць іх да свайго лагічнага, паслядоўнага завяршэння. Адзін з іх, нейкі Герман Гаух, напрыклад, праводзіць у сваёй кнізе «Новыя прынцыпы навукі аб расах» такую мяжу паміж «паўночным» і ўсім астатнім — «непаўночным чалавецтвам»:

«У чалавека непаўночнай расы карэнні зубоў размешчаны як у жывёлы. Чалавек паўночнай расы перажоўвае ежу з закрытым ротам, людзі другіх рас жуюць, як жывёла... Чыр воны колер узбуджае; ярка-пурпурныя губы чалавека паўночнай расы ўзбуджаюць каханне і жаданне цалавацца. У чалавека непаўночнай расы — шырокі рот і тоўстыя губы, якія сведчаць аб праганітай чуллівасці. На гэтых губах грае не ўсмешка, а злобная двудушная ўхмылка. Непаўночны чалавек плота ядна чмакае губамі — гэта яго характэрная рыса. Чалавек непаўночнай расы прадстаўляе сабой пераходную ступень ад чалавека да жывёлы. Ён бліжэй да малпы, чым да чалавека. Яго нельга назваць чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова».

Расавікі «непаўночнага» чалавецтва не застакоўца, зразумела, у даўгу. Французскі прафесар Хорж Хераабвяшчае, напрыклад, германцаў крывавэрнай расай грузных і аб жорлівых людзей, маючых пяжкія мазгі... На глебе канфліктаў паміж расісцкімі ідэолагамі часамі ўзнікаюць нават дыпламатычныя ўскладненні. На самой справе, у той час, як японскія расавікі абвяшчаюць, што японская раса нясе ўсяму свеце мяласць, што яна з'яўляецца «апомаральнасці», у гэты час некаторыя германскія расавікі ў сваёй класіфікацыі чалавецтва адносяць японцаў да «недачалавекаў»... Зусім натуральна, што паследавала адпаведнае прадстаўленне японскага міністэрства замежных спраў германскаму ўраду, у рэзультаце чаго былі зроблены афіцыёзныя заявы аб «японка-германскай роднасці душ» і высокіх расапічаючых чырвонаму імперыялізму совецтаў...

Раса ператвараецца ва універсальную адмычку, пры дапамозе якой можна прабрацца ва ўсе тайнікі гістарычнага працэсу, зразумець усе з'явішчы грамадскага жыцця — ад эканомікі да мастацтва.

Узброены такім «расометрам» шаноўны расісцкі тэарэтык, прыводзячы ў дзеянне адпаведныя вагары і стрэлкі, устанаўлівае, якія расавыя прыцяжэнні і адштурхоўванні абумовілі даную гістарычную подзею, якая ступень расавай чыстаты праявілася ў даным нацыянальным генні, якая ступень «чужой», «прымешаўшайся» крыві абясцэньвае творчасць паэта і т. д., і т. д.

Выходзячы ва усіх сваіх разважаннях аб жыцці грамадства з універсальнай катэгорыі расы, як увасабляюць важнейшай задачай, якая стаіць перад грамадзянам, барацьбу за «паляпшэнне расы» Яны ўнушаюць масам, што не ў «часавай барацьбе, не ў змене існуючых грамадскіх адносін, не ў рэволюцыйнай перабудове грамадства выхад з галечы, нядолі і голаду. Гэты выхад у «паляпшэнні расы»...

Як-жа аргументуецца гэта «паляпшэнне расы»? Неабходна ранней за ўсё забяспечыць першародную «чыстату» расы. Стварэнне фізічнай «чыстай расы», расісцкія тэарэтыкі абвяшчаюць важнейшай дзяржаўнай задачай ахову гэтай містычнай «чыстаты». Захоўваць чыстату расы, значыць не дапускаць не «забруджвання» чужароднай, чужаграмадзянскай крывёю, інакш гаворачы, ярабіць немагчымым.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Новыя віды сыравіны для харчовай прамысловасці

XVII з'езд ВКП(б) «абавязвае мясцовыя органы да праяўлення максімальнай ініцыятывы ў справе развіцця мясцовай прамысловасці і адшукання новых крыніц сырцу». Беларускі навукова-даследчы інстытут харчовай прамысловасці разам з некаторымі фабрыкамі і заводамі правёў велізарную работу па ўкараненню новых відаў сыравіны ў харчовую прамысловасць БССР. Мы каротка спынімся на значэнні некаторых культур для харчовай прамысловасці БССР.

Белая гарчыца — аднагадовая яравая расліна сям'і крыжацветных. Пашырана галоўным чынам у Англіі. Вопыты навукова-даследчага інстытута харчовай прамысловасці Беларусі паказалі, што белую гарчыцу можна культываваць і ў БССР. У 1932 г. белая гарчыца ў раёне Гомеля дала ўраджай 8,7 цэнтн. з га, а ў раёне Менска — 8,0 цэнтн. У 1933 г. па БССР было засеяна [illegible]00 га, а па плану 1934 г. павінна быць занята пад гарчыцу 3.900 га.

У Гомелі пабудован буйны тлушчавы камбінат, які штогод будзе даваць: маргарыну — 8.000 тон, мыла — 26.000 т., саламаса — 20.000 т.

Для вырабу маргарына патрэбны высокакаштоўныя тлушчы. Зерне белай гарчыцы мае ў сабе да 35 проц. тлушчу, які пасля апрацоўкі прыгодны для вырабу маргарыну. Апрача маргарынавай вытворчасці гарчычнае масла можа з поспехам скарыстоўвацца ў хлебапячэнні і кандытарскай прамысловасці.

Гарчычная макуха пасля апрацоўкі можа скарыстоўвацца на корм жывёле.

У недалёкім будучым нам неабходна ў зоне Гомельскага тлушчавога камбіната павялічыць пасеўныя плошчы пад гарчыцай да такіх памераў, каб забяспечыць завод гарчычным маслам. Выканаць пастанову СНК аб засеве 8.900 га пад гарчыцу і гэтым самым заложым цвёрды фундамент арганізацыі сыравінай базы для масла-бой на-тлушчавай прамысловасці БССР — гэта чарговая задача.

Тапінамбур — (земляная груша) або, як яго называюць, дзікая буль ба, расліна шматгадовая, клубняносная, складана-цветнай сям'і, вельмі падобна да сланечніка. Кажн аснавання тапінамбура ствараюцца клубні.

У БССР тапінамбур як у дзікім, так і ў культурным стане ёсць у Жыткавіцкім, Тураўскім, Петрыкаўскім, Быхаўскім, Рагачоўскім, Полацкім, Мсціслаўскім і іншых раёнах.

Вялікай перавагай тапінамбура лічыцца яго здольнасць даваць высокія і ўстойлівыя ўраджаі як клубняў, так і зялёнай масы. У 1932 г. у саўгасе «Пролетарый», Жлобінскага раёна, ураджай клубняў з га 210 цэнтн.

У гэтым годзе пад тапінамбурам павінна быць занята 1.000 га замест 70 га ў 1932 г.

Такое хуткае павялічэнне пасеўных плошчаў пад тапінамбурам тлумачыцца перш за ўсё тым, што тапінамбур — кармовая культура і яго клубні адначасова з'яўляюцца высокакаштоўнай сыравінай для харчовай прамысловасці. З клубняў тапінамбура можна атрымаць вельмі каштоўны плодовы цукар або фруктозу, якая ў паўтара разы саладзей звычайнага цукру. Плодовы цукар выробляецца для медыцынскіх мэт.

Клубні тапінамбура могуць скарыстоўвацца як сыравіна для спіртавой прамысловасці. Дзякуючы таму, што клубні тапінамбура без страт захоўваюцца ў зямлі на працягу ўсёй зімы, вясной яны могуць быць выбраны і пераапрацаваны на віпакураных заводах.

Беларускі навукова-даследчы інстытут харчовай прамысловасці су месна з фабрыкамі правёў паспяхова работы па ўжыванню клубняў тапінамбура для карамельных начынак і павідла.

Клубні тапінамбура могуць скарыстоўвацца і для харчавання.

Такім чынам павялічэннем пасеўных плошчаў пад тапінамбурам мы можам павялічыць сыравінную базу спіртавой, кандытарскай прамысловасці; падрыхтаваць базу для цукровай прамысловасці і забяспечыць нашы грамадскія сталоўкі ранняй агароднінай.

Рэвень — шматгадовая расліна з вялікімі шырокімі лісцямі, якія сядзяць на доўгіх тоўстых сакавітых чарашках.

Чарашкі ліста пласцінкі ўжываюцца ў ежу. Рэвень па каларыйнасці і спажыўнасці не ўступае таматам, гуркам і капусце. У рэвене ёсць шмат яблычнай кіслаты, дзякуючы чаму страва з рэвеня мае прыемны і асвяжаючы смак. Рэвень дае чарашкі і лісце ў канцы красавіка, так што з'яўляецца адзінай свежай гароднінай, з якой можна прыгатаваць боршч, галубцы, пудзінгі, кісель і т. д.

Рэвень з'яўляецца высокакаштоўнай сыравінай для начынак, павідла, варэння і віна. Сок і віно з рэвеня ўжываецца як лекавы сродак пры страўніка-почачных захворваннях.

Рэвень дае ўраджай да 30 тон з га і патрабуе нязначных затрат рабочай сілы.

Улічыўшы высокія спажыўныя ўласцівасці рэвеня, яго высокія ўраджаі, а таксама спрыяючыя гледбава-кліматычныя ўмовы СНК БССР пастанавіў у гэтым годзе правесці пасадку рэвеня на плошчы 52 га.

Мексіканскі тамат з'яўляецца блізкім сваяком звычайнага тамата. У 1933 г. былі праведзены вопытныя пасевы мексіканскага тамата ў 30 калгасах БССР, у тым ліку і ў прыгараднай гаспадарцы імя Дзержынскага, Менскага раёна. Вось што расказвае пра іх брыгадзір тав. Трушкевіч: «Пад мам наглядам былі пасаджаны на адноўкавых участках 2 віды тамата — звычайны і мексіканскі. З прычыны халоднага лета ў 1933 г. зрычайны тамат даў невялікі ўраджай, а мексіканскі са 100 кв. м. даў ураджай 205 кгр. — 205 цэнтн. з га.

Беларускім навукова-даследчым інстытутам харчовай прамысловасці былі з поспехам праведзены вопыты па скарыстанню тамата для прыгатавання варэння, начынак для цукерак, джэма. Значыць, мексіканскі тамат можа быць сыравінай для нашай кандытарскай і плодагароднай прамысловасці. Апрача таго салёныя мексіканскія таматы не горш звычайных.

СНК БССР пастанавіў у 1934 г. заняць не менш 30 га пад мексіканскі тамат.

Рапс адносіцца да маслічных культур, дае высокатэхнічнае масла для мылаваранай прамысловасці. Ён пашыран у Германіі, Бельгіі, Галандыі, Польшчы. У Совецкім Саюзе—на тэрыторыі Палесся (УССР). У дарэвалюцыйны час рапс засяваўся на тэрыторыі сучаснай БССР і Заходняй вобласці.

У 1930 г. у саўгасах Палесся рапс даў ураджай 12-13 цэнтн. з га. Па колькасці выхада масла рапс не ўступае ні адной культуры. Масла рапса з поспехам можа ўжывацца ў мылаваранай вытворчасці, у прыватнасці, на Гомельскім тлушчавым камбінаце. Улічваючы гэта, СНК БССР абавязвае НКЗ БССР і яго сетку навукова-даследчых устаноў зрабіць у гэтым годзе пробныя пасевы рапса па некалькіх дзесятках га.

Цяпер новыя віды культур харчовай прамысловасці займаюць вельмі невялікую плошчу. Дзякуючы сваім высокім якасцям гэтыя новыя віды сыравіны павінны заняць аднаведнае месца на калгасных і саўгасных палях. Перад Наркамземам БССР, перад яго навукова-даследчымі арганізацыямі стаіць задача—не толькі забяспечыць пасеўныя плошчы новых культур, але і дабіцца максімальных ураджаяў. Новым культурам павінна быць аддана максімум увагі. Не бросавыя землі, не пустыры павінны быць адведзены пад новыя культуры, а лепшыя добра ўгноеныя землі. Кожны калгас і кожны саўгас павінен быць узброен навейшай агратэхнікай.

Наркамснаб, яго трэсты і паасобныя заводы павінны не толькі ўкараняць новыя культуры ў вытворчасць, а штогод ведаць і аказваць дапамогу па асваенню новых культур для харчовай прамысловасці БССР.

Я. ЯРМАШЗВІЧ.

Менскі дом тэхнікі

Фота ДАШКЕВІЧА

У кабінеце рабочага вынаходства.

ХЛЕБАЗАКУПКІ

БАЛБАТНЯ—ЗАМЕСТ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

Аршанскі раён, які з'яўляецца адным з рашаючых па закупках хлеба, абавязаўся закупіць 700 тон. На ўсебеларускай нарадзе па хлебазакупках яшчэ ў пачатку кампаніі былы старшыня райсаюза **Песін** горда заявіў: «Раз мы ўзяліся, то зробім».

Але гэта было толькі пустой балбатнёй. Колькасць закупленага хлеба павялічваецца вельмі і вельмі павольна. Да 15 сакавіка спажывецкая кааперацыя Аршаншчыны закупіла толькі 103 тоны.

Мясцовыя арганізацыі ўжо з першых дзён закупак «кіруюць» толькі з кабінетаў. Да апошніх дзён ніхто ў сельпо не выязджаў. Старшыня райсаюза «накачваў» работнікаў сельпо ў сваім кабінеце, чытаў ім «лекцыі» аб значэнні закупак. Старшыні сельпо абяцалі зрабіць усё што трэба. Але яны ад'язджалі—і ўсё заставалася па-старому. А райком і РВК, прыняўшы агульную рэзалюцыю, заспакоіліся: «Няхай райсаюз робіць».

РВК склікаў яшчэ месяцы два назад нараду старшынь сельсоветаў, на якой «паставіў пытанне рубам». А ў сельсоветах нічога не робіцца.

Багушэўскае сельпо абавязалася закупіць 45 тон. Трэба было адразу-ж разгарнуць масавую работу ў калгасах, заключыць дагаворы з калгасамі, арганізаваць развозку тавараў. А ў Багушэўску толькі 16 лютага ўспомнілі аб закупках. Да гэтага дня ў сельпо арудаваў растратчык **Паўлаў**, які ўтойваў розныя злачынствы ў сельпо. Калі-ж яму думаць аб закупках! Новаму старшыні **Позняку**, які старанна ўзяўся за работу, ні сельсавет, ні парт'ячэйка не дапамагаюць. Старшыня сельсовета **Кудзін** нахабна заяўляе: «Я ем хлеб, досыць і гэтага, а закупляць няма часу, трэба мяса загатаўляць». У Багушэўску сядзеў член праўлення райсаюза тав. **Бененсон**, які закупкамі хлеба зусім не займаўся.

Не атрымліваючы патрэбнага інструктажа, старшыня сельпо Позняк надумаўся арганізаваць у калгасе «Другая пяцігодка» камісію, якая будзе хадзіць па хатах і збіраць хто сколькі хлеба дасць. Але прадстаўнік Белкаапсаюза, які быў тады ў калгасе, зусім правільна выступіў супроць гэтай прапановы, якая падмяняе арганізацыйна-масавую работу зборам нейкіх ахвяраванняў. Да 10 сакавіка Багушэўскае сельпо закупіла толькі 8 цэнтн.

Крапівенскае сельпо закупіла 300 кілограм. У чатырох крамах няма прамтавараў. Работнікі кааперацыі за таварамі не едуць, усё абяцаючы калгаснікам, што «сёння прывязуць тавар». Не дзіва, што калгаснікі з Крапівенскага сельсовета вязуць свой хлеб у крамы Панізоўскага сельпо.

Рудкаўскае сельпо праявіла каштоўную ініцыятыву—развозку тавараў (чыгуны, хусткі, мыла, мануфактура) непасрэдна ў калгасы і прыём заказаў па патрэбных промтавары. Калгаснікі тут-жа прадалі каля 5 цэнтн. Гэты вопыт павінны пераняць іншыя сельпо.

Газета «Ленінскі прызыў» дрэнна арганізоўвае хлабазакупкі, не паказвае сапраўдных прычын зрыву кампаніі, не выкрывае тых работнікаў сельпо, якія не вылазяць з канцылярыі крам, чакаючы, пакуль калгаснік даставіць хлеб, не выязджаюць у калгасы і вёскі.

«Ленінскі прызыў» сваім матэрыялам аб закупках часта дэзарыен туе чытачоў. У артыкуле **«Як Баранскае сельпо арганізавала чырвоны абоз»** ён прапануе ўсім сельпо выкарыстаць вопыт баранскіх кааператараў, і тут-жа, побач, дае раённую зводку, у якой напісана: «Баранскае сельпо выканала 0,08 проц. свайго абавязацельства».

Чаму-ж сельпо сарвала план закупак, чаму вучыцца ў баранскіх кааператараў—газета не дае адказу.

Толькі пасля тэлеграмы сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Гікало** ў сельсоветы выехаў рад работнікаў раённага актыва для практычнай работы на мясцах.

КІЗІЛА.

„НЕАБХОДНАСЦЬ У МЕХАНІКУ МІНАВАЛА"

(ПІСЬМО ДЫРЭКТАРА АЎТАТЭХНІКУМА).

У студзені Гомельскі аўтатэхнікум выпусціў 132 тэхнікаў-аўтаманікаў. Выпускнікі былі накіраваны ў распараджэнне Наркамзема БССР для скарыстання па спецыяльнасці ў МТС і МТМ.

У часе выпуску прыязджалі прадстаўнікі НКЗ і размяркоўвалі маладых спецыялістаў на работу па раёнам. Ім выдалі пуцёўкі, грошы на праезд да месца службы і т. д. Зрабілі ўсё што трэба. Але на справе аказалася інакш.

У тэхнікум паступае дзесяткі пісьмаў ад былых студэнтаў аб тым, што вакантных месц у радзе МТС няма. Некаторыя МТС паведамляюць, што ім механікі не патрэбны. Вось пісьмо сакратара Слуцкай МТС выпускніку механіку тав. Гладкіну.

«Неабходнасць у механіку ў Слуцкай МТС мінавала. Апрача таго, вы скончылі аўтадарожны тэхнікум, а не трактарны. Кватэр у МТС няма і ў Слуцку на іх вялікі недахоп».

Студэнты-выпускнікі і дырэкцыя аўтатэхнікума не раз звярталіся ў Галоўдартранс і ў транспартную групу ЦКК, але ніякага адказу не атрымалі.

Гэта валакіта і бюракратычныя адносіны да маладых спецыялістаў сведчаць аб тым, што работнікі НКЗ і Галоўдартранса працуюць па-старынцы. Яны не дагаварыліся з месцамі аб накіраванні спецыялістаў, а па-бюракратычнаму ў габінеце размеркавалі выпускнікоў.

ГАРЗЛІК.

ДВУХДЭКАДНІК ЗАГАТОВАК і ВЫВАЗКІ ЛЕСУ

ЗРЫВАЮЦЬ ЛЕСАВЫВАЗКУ

(Ад карэспандэнта «Звязды»).

Ва Ўраравіцкім раёне шматлікія пленумы, пасяджэнні прэзідыума РВК і сельсоветаў, нарады старшынь калгасаў і сельсоветаў — звычайнае з'явішча. Звычайнымі сталі прамовы раённых работнікаў, якія горача заклікаюць своечасова выканаць план лесазагатовак, і прамовы старшынь калгасаў і сельсоветаў, якія не менш горача абавязваюцца выканаць план.

На справе-ж з 25 лютага ў лес не выязджала ні адна падвода. У калгасе **«Авангард»** больш 150 коняй не працуюць. Сабатуюць выкананне плана загатовак і вывазкі лесу калгасы імя **Будзённага, «Чырвоны шлях», «Новае жыццё», «Комунар»** і інш. Ніякага зруху ў загатоўках і вывазцы лесу няма па **Глазаўскаму, Навасельскаму, Целяшоўскаму, Чабатовіцкаму і Смычкоўскаму** сельсоветах.

Прэзідыум райвыканкома не здолеў нічога прыдумаць, акрамя абвяшчэння вымовы старшыням Глазаўскага і Чабатовіцкага сельсоветаў, Карысці ад гэтай меры аказалася вельмі мала: як і раней — сельсоветы цягнуцца ў хвасце.

А. КАЗІМІРАЎ.

ДА АДКАЗНАСЦІ БЮРАКРАТАЎ

Рэчыцкі леспрамгас паспяхова змагаецца за выкананне праграмы першага квартала 1934 года.

Адначасова трэба адзначыць, што гомельская база ОРС Лесбела, начальнікам якой з'яўляецца **Фрыдман**, увесь час зрывае своечасовае снабжэнне леспрамгаса прадуктамі і промтаварамі. 10 сакавіка на базу былі пасланы чыры падводы за атрыманнем макароны. Фрыдман адаслаў падводы назад, матывуючы тым, што ў упаўнаважанага ОРС леспрамгаса не было даведкі Дзяржбанка аб адсутнасці ў ОРС запазычанасці. І гэта ў той час, калі база мае запазычанасці ОРС'у на суму ў 1.000 рублёў.

ОРС леспрамгаса на працягу ўсяго першага квартала атрымлівае рыбу, макарон і іншыя нарыхаваныя прадукты, пасля таго, як яны пралежвалі на базе ОРС'а значны час. Гэта адбіваецца на своечасовым снабжэнні лесарубаў і возчыкаў.

ГІНЗБУРГ.

У СНК БССР

БЕЛГАНДАЛЬ І БЕЛКААПСАЮЗ НЕ КІРУЮЦЬ ГАНДЛЕМ

На пасяджэнні Совета Народных Камісараў БССР 15 сакавіка нам. старшыні Камітэта таварных фондаў пры СПА тав. **КВІРЫНГ** паведаміў аб выніках праверкі становішча таваразвароту па БССР.

Дакладчык падкрэсліў **абсалютна нездавальняючае становішча гандлёвай работы па БССР**. Квартальны план рэалізацыі па 10-ці важнейшых таварах за два месяцы выкананы толькі на 45 проц. Астаткі тавараў на базах прамысловасці з 1 студзеня па 1 сакавіка выраслі амаль у два разы, асабліва па швэйных вырабах. Прычыны гэтага карэняцца ў няведанні і невывучэнні попыту насельніцтва, у ігнараванні асартымента, у панскіх, пагардлівых адносінах да совецкага гандлю.

Тавары вельмі часта асядаюць у гуртовых звеннях, што прыводзіць да пагоршання фінансавага становішча сістэмы і закрыцця крэдытаў.

Тав. Квірынг прывёў рад прыкладаў механічнага размеркавання тавараў і ігнаравання патрабаванняў спажыўца. Яшчэ ў красавіку 1933 г. база **Саюзшкалозбыту** прыслала Чэрвеньскаму райсаюзу 18.000 стаканаў. Райсаюз не пратэставаў супроць механічнага завозу тавараў, увесь час маўчаў, цяпер затаварыўся і не ведае, што рабіць. Характэрна, што ў той час, як склады райсаюза завалены стаканамі, у суседніх сельпо (Вальвачыцкім і інш.) іх няма. Белкаапсаюз да апошняга часу не ведаў аб гэтым, ніхто з прадстаўнікоў Белкаапсаюза ў Чэрвені не бываў.

У магазінах **барысаўскага** ЦРК няма дэмісезонных польтаў і касцюмаў, а базы завалены швэйнымі вырабамі, якія не выкупляюцца.

Агенты спажывецкай сістэмы ў пагоні за процантамі закупляюць няходкія, непатрэбныя тавары, кааперацыя бярэ іх, не звяртаючы ўвагі на якасць і асартымент. У рэзультаце — вялікае затаварванне і страты.

Тав. Квірынг асабліва завастрыў пытанне аб **рэнтабельнасці сельпо**. Спажывецкая кааперацыя БССР вельмі слаба змагаецца за рэнтабельнасць гандлёвай работы. Узяць хоць-бы Чэрвеньскі райсаюз. Толькі 6 сельпо Чэрвеньшчыны мелі ў 1933 годзе прыбыткі, а 7 скончылі год з вялікімі стратамі. Характэрна, што ў Белкаапсаюзе дагэтуль няма даных аб рэнтабельнасці работы сеткі ў 1933 годзе.

Дабіцца, каб усе сельпо і ЦРК працавалі рэнтабельна, без страт — адна з асабліва важных задач спажывецкай кааперацыі.

А як выканана дырэктыва аб **адкрыцці раённых магазінаў па гандлю складаным асартыментам?** Да апошняга часу адкрыта **толькі 35** магазінаў з патрэбных 65-ці. Смалявіцкі райсаюз паведаміў, што магазін адкрыт 20 лютага, калі-ж праверылі, аказалася, што магазін не адкрыт і па сёння.

Тав. Квірынг даў рэзкую ацэнку работы Белгандалю.

Каб прыкрыць сваю дрэнную работу, каб утаіць сапраўднае станоўішча ад грамадскасці, Белгандаль склаў у мінулым годзе дуты, ашуканчы баланс. Белгандаль утаіў факт праядання зваротных сродкаў, змяншэннем іх на 2 млн. руб. Няўменне разгарнуць совецкі гандаль прыняло сістэму Белгандля да фінансавых затрудненняў, да зрыву таваразвароту, план якога за люты выканан толькі на 71 проц.

На прыкладзе работы барысаўскага і чэрвеньскага магазінаў Белгандля т. Квірынг паказаў, як нельга гандляваць.

...ымым змешаныя шлюбы, атручваюць чыстакроўную расу прыродаўладных арыстакратаў і панаў сапсаваюць крывёю другіх, ніжэйстаячых расы. У доказ гэтага налажэння вулканы сікафанты сучаснай буржуазіі выпускаюць «фундаментальныя» манаграфіі, запаўняюць біялагічныя, эканамічныя, сацыялагічныя і, нарэшце, спецыяльна гэтай праблеме прысвечаныя журналы даследаванняў на тэму аб тым, якія неалічоныя колькасці мясцоў «расе выбраных» шлюбы не прадстаўнікоў з расавадэгенерацыямі. Не прыходзіцца гаварыць аб тым, што вышэйназваным праяўленням падобнага роду «прыродзіцыяльных», «антыдзяржаўных» злачынных шлюбаў ўжываецца сувязь «арыйца» з «неарыйцам». У апошнім выпадку «слова» ідзе ад прафесарамі пераходзіць непасрэдна да «штурмавікоў», маюць у сваім распараджэнні ўвесь шэнал сярэдневяковых мер уздзеяння на злачынных парушальнікаў падуманай расавай чыстаты. Нарэшце ўжываюцца ўсе ранейшыя мерапрыемствы, якія адпаведных мерапрыемстваў лічаецца крымінальным кодэксам «трэцяй імперыі», устанаўліваюць «пазбаўленне волі за падобнага роду «расавую здраду»...

II.

Барацьба з «расавай здрадай» з'яўляецца толькі адным з шматлікіх ...ў, характарызуючых фашысцкае ...наўства. Важнейшай часткай ...знаўства», культывуемага Гітлерам і Ленцамі, з'яўляецца барацьба з біядзетнасцю і маласямейнасцю. ...ння абяшчаюцца такім-жа злачынствам, як і расавая здрада. Фашыстуючыя расазнаўцы настойваюць на трывогу з поводу «катастрофы, якая падзенне нараджэння» ў Германіі, ва Францыі, у Аўстрыі, у Італіі, у Нарвегіі, у Швейцарыі. У 1910 годзе ў Германіі прыходзілася на 1.000 жыхароў 28 нараджэнняў, а ў 1932 годзе іх прыходзіцца 15», «у 1890 годзе прынесла дзяржаве дзіцё адна з трох замужніх жанчын; у 1910 г. — адна з чатырох; у 1925 г. — адна з сямі; у 1930 г. — адна з васьмі». «Народ, жанчыны якога не жадаюць больш раджаць, павінен загінуць». «Гора народу, жанчыны якога дасягнулі такой ступені выраджэння, што страцілі натуральнае жаданне мець дзяцей». «Народ у небяспецы» — так на розныя лады істэрычна выкрыкваюць усе гэтыя Гельмуты, Бургдэрферы, Штэрнбергеры, Малісаны і іншыя глашатаі «нацыянальна-еўгенічнага» шарлатанства.

Фашысцкія тэарэтыкі ўзмоцненна распрацоўваюць сістэму мерапрыемстваў, заахвочваючых дзетанараджэнне. Уводзяць усялякія праекты стымулявання шматсямейнасці (павелічэнне пенсіі, змяншэнне падаткаў) і барацьба з біядзетнасцю (аж да практыкі забароны папярэджання нараджэнняў).

«Нацыянальна-еўгенічнае» выхаванне, якое базуецца на абстрактным, пазбаўленым гістарычных прыкмет, упадабляючым чалавечае грамадства з стадам жывёлы, законе падзялення ператвараецца ў адзін з краяўгольных каменняў усёй выхаваўчай сістэмы буржуазных дзяржаў загніваючага капіталізма. Ва ўсёй школьнай сетцы гітлераўскай Германіі, ад народных школ, кончаючы ВНУ, уведзена абавязковае выкладанне такіх дысцыплін, як расавая гігіена, як вучэнне аб народзе і насяленні, як вучэнне аб спадчыннасці.

Барацьба за «паляпшэнне расы», якую вядзе буржуазная дзяржава гадоў закату капіталізма, не абмяжоўваецца толькі аховай «чыстаты расы» і праблемай паведлічэння дзетанараджэнняў. У цэнтры гэтай барацьбы стаіць так званае пытанне аб няпоўнацэнным патомстве. Адным з цэнтральных, калі не рашаючым, «нацыянальна-еўгенічным» мерапрыемствам абвяшчаецца процідзеянне з'яўленню на свет спадчынна-дэфектыўных. Стэрылізацыя і кастрацыя абвяшчаюцца тымі цудадзейнымі сродкамі, якія раз назаўсёды пазбаўляюць чалавецтва ад біялагічных і інтэлектуальных адхіляў, ад людскога баластву, якія разгрузяць дзяржаўны бюджэт ад непрадукцыйнай траты «народных сродкаў», якія выведуць свет з тупіка крызіса...

Самы ўплывовы орган англійскіх прыродазнаўцаў журнал «Нечур» у апошні час актыўна выступае за дзяржаўную стэрылізацыю, ясна фармулюючы класавыя матывы гэтага мерапрыемства. Журнал заяўляе, што стэрылізацыя «з аднаго боку аслабляе цяжар падаткаў для плацельшчыкаў, а з другога з'яўляецца практычным крокам да папярэджання далейшага пагоршання расы».

Стэрылізацыю ўжо ажыццяўляюць і яе санкцыянаваў законадаўчым шляхам рад капіталістычных дзяржаў, — звыш 20 штатаў ЗША, некаторыя правінцыі Канады, Швейцарыі, Фінляндыі, Нарвегіі, Германіі... Асноўны матыў для ажыццяўлення стэрылізацыі — барацьба за «аздараўленне расы». Якое шырокае поле раскрываецца пры гэтым пад «аздараўленцам», відаць з таго, што ў ЗША лік асоб, якіх палова-б падвергнуць стэрылізацыі з прычыны неблізкі, якую яны прадстаўляюць для расы, вызначаецца ці лічбай у... 10 млн. чалавек.

Прыклад найбольш адкрытага і **класава-аголенага прымянення стэрылізацыі** прадстаўляе сабой адпаведны германскі закон, увайшоўшы ў сілу з 1934 года. Па гэтаму закону павінна быць абяспладжана 400.000 чалавек. Уводзячы абавязковую стэрылізацыю для 9 катэгорый насельніцтва, фашысцкі закон адкрывае найшырэйшыя магчымасці для самай утончанай і раз'юшанай класавай расправы фашыстаў са сваімі ворагамі. Даючы фашысцкім экспертам неабмежаваную магчымасць устанаўляць «псіхічную няпоўнацэннасць», прадастаўляючы начальнікам месц зняволення права патрабаваць правядзення стэрылізацыі па іх погляду, гэты закон усёй сваёй вострасцю накіраван супроць рабочага класа і працоўных мас.

Не будзем ужо гаварыць аб тым, што ў аснове закона аб стэрылізацыі ляжыць ілжывая прадпасылка, якая базуецца на ілжэ-сведчаннях пісёўда-вучоных фашысцкіх аўтарытэтаў, ах тым, што псіхічнае захворванне аднаго з бацькоў абавязкова дае дэфектыўнае патомства (недарма фашысцам напамінаюць аб тым, што калі-б іх закон быў уведзен у жыццё стагоддзем раней, то яго ахвярамі аказаліся-б нямала бацькоў і матак, дзядоў і бабуль найбольш геніяльных вучоных, пісьменнікаў, артыстаў XIX века)...

Усё гэта, зразумела, не перашкаджае гітлераўскім спадручным з вучонага цэха разводзіць найвялікшую спекуляцыю з повару таго, што закон аб стэрылізацыі стварае «новую эру» ў гісторыі германскай расы і дэмагагічна бравіраваць тым, што гэты закон прынясе «нацыі» эканомію ў 20 мільярдаў марак штогод...

Мы ахарактарызавалі рад асноўных установак ідэолагаў загніваючага капіталізма па пытанню аб «чыстаце расы». Яны нас шчыльна падводзяць да ідэі, якая вянчае, так сказаць, усё «біялагічнае светасузіранне» і прадстаўляе сабой лагічны вывад з гэтых папярэдніх установак.

Для таго, каб забяспечыць абсалютную «чыстату расы» і належнае развіццё «чалавечай пароды», увасобленай у данай расе недастаткова забараніць змешаныя шлюбы, прэміраваць шматдзетных і кастрываць пару сот тысяч «няпоўнацэнных». Для гэтага трэба наогул пакончыць са «стыхіяй» дзетанараджэння і перайсці да планамернага, арганізаванага, ажыццяўляемага па ўсіх правілах расісцкай навукі «развядзення людзей»...

Ідэя «чалавекаводства», прадстаўляючая сабой удзячную тэму для пяра фельетаніста, магла ўзнікнуць толькі ў мазгу эксплаататара, з-пад ног якога ўходзіць глеба. Толькі ідэолагі капіталістычнага закату могуць з усёй прафесарскай сур'ёзнасцю пісаць вучоныя даследванні ў яе абарону.

Непераўзойдзеным узорам такога роду твораў з'яўляецца, напрыклад, нашумеўшая кніга прафесара філасофіі Лейпцыгскага універсітэта Эрнста Бергмана «Дух пазнання і мацярынскае права».

Лейпцыгскі філосаф жорстка высмейвае тых прастакоў, якія ў сваёй наіўнасці лічаць, што разводзіць можна толькі тульпанныя лукавіцы або каракулевых барашкаў. Трэба разбурыць гэта ганарлівае самазманенне. Трэба перайсці да тых-жа спосабаў развядзення людзей, якія практыкуюцца прыстасоўна да тульпанаў і барашкаў. Бо народ, багаты бяздзетнымі жанчынамі, старымі дзевамі, прастытуткамі і расчараванымі мужападобнымі жанчынамі, знаходзіцца на краю пагібелі. Адзінае выратаванне ў тым, каб жанчына вярнулася да яе прыроднага прызначэння — быць маткай, каб дзяржава перайшла да штучнага развядзення людзей па агульных прынцыпах зоатэхнікі. «Чалавек пры сучасным грамадскім ладзе займаўся жывёлагадоўляй, але ніколі не займаўся і не мог займацца чалавекаводствам, — гаворыць Бергман — хоць гэта яму было, быць можа, больш неабходна, чым жывёле, якая яму належала, — аб гэтым сведчыць погляд на нашы турмы, вар'яцкія дамы, на ўсю нашу культуру... Што-ж будзе тады з любоўю, усклікнуць. Бог мой, што-ж адбывацца з ёю ў сучасны момант? Дзе-ж яшчэ ў наш матэрыялістычны век уступаюць у шлюб па любві?..»

Так выглядае ў яго поўным завяршэнні і лагічнай паслядоўнасці «біялагічнае светасузіранне» сучасных эпігонаў буржуазнай філасофіі, для якіх чалавечае грамадства з'яўляецца нічым іншым, як стадам жывёлы няўпай пароды. Іх «скоцкая» ідэалогія прапагандуе стварэнне такога «грамадскага ладу», трыма кітамі якога былі-б канцэнтрацыйны лагер, божы храм і універсальны злачынны пункт — для тульпанаў, барашкаў і людзей... Фашысты ўжо дабіліся некаторых поспехаў па шляху ажыццяўлення гэтага ідэала...

Толькі сляпы не ўбачыць за ўсімі гэтымі філасофідмі чалавекаводства, за ўсёй гэтай невуцкай абракадабрай тэарэтыкаў «біялагічнага светасузірання» класавага твара смяртэльна напалоханага ўзнімаючайся рэвалюцыйнай хваляй і лавіруючага ў пошуках выратавання эксплаататара...

Як-бы не распіналіся ідэолагі загніваючага капіталізма ў доказах таго, што класы гэта «марксісцкі міф», што гісторыя чалавецтва гэта «гісторыя барацьбы рас», колькі-б яны не пісалі аб «адзінай», аб «тоталь най», аб «маналітнай» расе, яны самі не бяруць усяго гэтага сур'ёзна. Дэмагагічна дурманячы масы і не сучы тым сваю службу фінансавому капіталу, яны ні на секунду, зразумела, не забываюць аб тым, што іх славутая адзіная раса складаецца з «расы» эксплаататараў і «расы» эксплаатуемых.

Плебейскай «расе» пролетарскіх «падонкаў» паны Шпенглеры процівастаўляюць «расу» сваіх гаспадароў, у якіх «шляхетны інтэлігентны твар, вузкая нага, прыгожая хада»...

Шпенглер у сваёй апошняй кнізе занадта адкрыта сказаў тое, аб чым думаюць, але што старанна ўтойваюць дзесяткі другіх «расісцкіх» тэарэтыкаў. Іх клопаты аб «чыстаце расы» абазначаюць нішто іншае, як трывогу за лёс свайго класа і гэтай трывогі ім не ўдасца ўтаіць... Адзін з кіруючых расісцкіх органаў нямецкі журнал «Народ і раса» вельмі ярка перадае гэта пачуццё трывогі. Бяда не ў тым, што падае дзетанараджэнне, заяўляе журнал. Няшчасце ў тым, што «якраз нашы жанчыны, жанчыны поўнацэннага, культурна-вядучага, сацыяльна-высока стаячага грамадскага слоя або ўсім не раджаюць дзяцей або абмяжоўваюцца нараджэннем не больш двух дзяцей».

Іменна ў гэтым скрыты сэнс шматлікіх пісанняў тэарэтычных ландскнехтаў паміраючага капіталізма, якія пад барабанны бой фашысцкага расазнаўства прабуюць «біялагічна абнавіць» клас сваіх гаспадароў і, уліўшы ў яго новую кроў, зрабіць яго больш здольным для барацьбы з пролетарыятам. Смешныя і мізэрныя патугі наймітаў класа, гібель якога абумоўлена ўсім ходам гістарычных падзей, усімі суадносінамі класавых сіл на сучаснай палітычнай арэне...

ЗАБАСТОВАЧНЫЯ БАІ ІСПАНСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА ПРАДАЎЖАЮЦЦА

ПАРЫЖ, 19. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Мадрыда, забастоўка металістаў прадаўжаецца.

У загадзе міністра ўнутраных спраў аб забастоўцы будаўнікоў гаворыцца, што для будаўнікоў павінен быць уведзен 44-гадзінны рабочы тыдзень з захаваннем зарпла ты за ранейшы 48-гадзінны рабочы тыдзень. Пасля гэтага рэфармісцкія і анарха-сіндыкалісцкія профсаюзы распарадзіліся, каб будаўнікі адналі работу. Аднак, прадпрыемцы не згаджаюцца выканаць загад міністра. Чакаюць, што забастоўка адновіцца. Як вядома, будаўнікі баставалі ў апошнія дні паўторна, з прычыны адмаўлення прадпрыемцаў выканаць умовы, на якіх была закончана першая забастоўка.

У Каталоніі забастоўка газавых заводаў і электрычных станцый прадаўжаецца. Войскі займаюць гасоўныя заводы. Выбухнула забастоўка рабочых электрычнай чыгункі Барселона — Тараса, якая злучае Барселону з многімі вакольнымі гарадамі. Нават французская буржуазная «Экстэльсіор» паведамляе, што аўтарытэт іспанскай соцыялістычнай партыі падае і што разам з тым значна ўзмацніліся пазіцыі іспанскай компартыі.

РАБОЧЫЯ РАЗАГНАЛІ ФАШЫСЦКІ МІТЫНГ

ПАРЫЖ, 19. (БЕЛТА).

У Суасоне 2 тыс. рабочых па заклику компартыі разагналі мітынг фашысцкай арганізацыі «Аксіён франсез». У Ольнэ рабочыя разагналі мітынг фашысцкай арганізацыі «Жэнес патрыёт». У Ля-Рошэле таксама прыбыўшыя з Парыжа прадстаўнікі гэтай арганізацыі былі збіты і з ганьбай выгнаны з горада.

* *

ПАРЫЖ, 19. (БЕЛТА).

Учора адбыўся наладжаны Мопрам вечар, прысвечаны гадавіне Парыжскай Камуны. Прысутнічала некалькі тысяч рабочых і работніц.

З дакладам выступіў член ЦК французскай компартыі Марці, які быў спатканы спевам «Інтэрнацыянала». Марці падробна спыніўся на вялікім вопыце Окцябрскай рэволюцыі і на вучэнні Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, якое ўказвае шлях да перамогі. Даклад прарываўся апладысментамі і выгукамі «Няхай жыве совецкая ўлада», «Няхай жыве адзіны чырвоны фронт».

Пасля Марці выступіў ветэран Парыжскай Камуны. Сабрана значная сума ў фонд МОПР.

ФРАНЦЫЯ АДХІЛЯЕ БРЫТАНСКІ МЕМАРАНДУМ

ПАРЫЖ, 18 (БЕЛТА).

Французскі адказ на брытанскі мемарандум па пытаннях аб разбраенні быў аднагалосна прыняты на апошнім пасяджэнні совета міністраў і неадкладна перадан у Лондан. Тэкст адказа будзе апублікаван праз 3-4 дні. Але яго змест ужо вядомы. Па сутнасці ён зводзіцца к вострлівому адмаўленню прыняць асноўныя прапановы брытанскага мемарандума, які прадугледжвае скарачэнне ўзбраенняў Францыі пры адначасовым даўзбраенні Германіі і які не прадастаўляе Францыі ў галіне безапаснасці нічога апрача «кансультацыі».

Сёння апублікован тэкст адказа Германіі на брытанскі мемарандум. Друк падкрэслівае, што гэты адказ нічога не дадае да вынікаў франка-германскіх перагавораў.

Адначасова паведамляюць, што французскі генеральны штаб падрыхтоўвае кампанію за прадаўжэнне тэрміна ваеннай службы да 18 месяцаў або 2-х год і за павелічэнне прафесіянальных кадраў арміі.

ЗАЯВА ЯПОНІІ ЛІЗЕ НАЦЫІ

ТОКІО, 18 (БЕЛТА).

Урад паведаміў сакратарыят Лігі нацый аб адмаўленні Японіі ўдзельнічаць у міжнародным пагадненні 1927 г., якое забараняе ўводзіць абмежаванні ў знешнім гандлі і мытным перамір'і 1933 г.

ПЕРАМОГА ГАРЯКОЎ ШТАТА АЛАБАМА

НЬЮ-ІОРК, 18 (БЕЛТА).

«Асашыэйтэд прэс» паведамляе аб перамозе 10 тыс. гарнякоў бітумінозных шахт у штаце Алабама, баставаўшых месяц. Уласнікі шахтаў абавязаліся прызнаць профсаюз і павысіць заработную плату. Войскі эвакуіравалі раён стачкі.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ У АБАРОНУ СКОТСБОРЦАЎ

Н'Ю-ІОРК, 18 (БЕЛТА).

Адбылася дэманстрацыя 5 тыс. негрыцянскіх і белых працоўных у абарону нявольнікаў Скотсборо. Паліцыя абрушылася на дэманстрантаў, прымяняючы слёзатачывыя газы. Дэманстранты аказалі супраціўленне і трымаліся больш гадзіны, перш чым паліцыі ўдалося іх рассеяць. З абодвух бакоў ёсць раненыя.

ПЕРАД УСЕАГУЛЬНАЙ ЗАБАСТОЎКАЙ НА КУБЕ

Н'Ю-ІОРК, 18 (БЕЛТА).

Кубінскі ўрад аб'явіў аб арганізацыі новых профсаюзаў пад урадавым кантролем, замест забароненых рэволюцыйных. Рабочыя падрыхтоўваюць усеагульную забастоўку для барацьбы супроць урадавых пастаноў. У правінцыі Орыенце забастовачны рух ахапіў 60 тыс. рабочых. Уплыў компартыі расце. Многія члены АБЦ (арганізацыя, лідэры, якой падтрымліваюць урад) пераходзяць да камуністаў.

У АМЕРЫКУ НА СОВЕЦКІМ ЦЕПЛАХОДЗЕ

Фота КРАЙНІЦКАГА (С. Ф.)



Адкрыта рэгулярная таварапасажырская лінія Адэса-Н'ю-Іорк. Совецкі цеплаход «КІМ» знаходзіцца ўжо на шляху ў Н'ю-Іорк.

НА ЗДЫМКУ: Параход «КІМ»

НОВАЕ Ў АРГАНІЗАЦЫІ І АХОВЕ ПРАЦЫ

Беларускі навукова-даследчы інстытут працы, у Менску, рэарганізован у інстытут савэтнага значэння са спецыялізацыяй па пытаннях працы ў тарфяной, дрэваапрацоўчай і запалкавай прамысловасці.

Асінторф і торфазавод «Большэвік», Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат і запалкавая фабрыка «Пролетарская перамога» ў Барысаве з'яўляюцца яго эксперыментальнымі базамі. Інстытут кіруе лабараторыямі па гігіене працы і профкансультацыямі ў Віцебску, Гомелі, Магілеве і Бабруйску.

У 1933 г. інстытутам распрацована каля 30 пытанняў. Падамо некаторыя даныя. Света-тэхнічнай лабараторыяй складзен тыповы праект пражэктарнага асвятлення агрэгатаў на торфазаводах.

Распрацавана сістэма рацыянальнай вентыляцыі аўтаматных цэхаў на запалкавых фабрыках. Пераабсталёўваецца вентыляцыя па новаму праекту на «Пролетарскай перамозе». Вопытная вентыляцыя па новай сістэме ў аднаго аўтамата дала 80-85 проц. эфекта па змяншэнню шкод насці. У сучасны момант інстытутам прапрацоўваецца пытанне аб санітарна-тэхнічнай рацыяналізацыі аўтамата, што поўнасцю павінна забяспечыць безапаснасць і здаровыя ўмовы працы ў аўтаматных цэхах.

Брыгада інстытута, вывучаючы на Бабруйскім камбінаце пытанні зарплаты і тэхнармавання, на самым адсталым участку — біржы піламатэрыялаў дабілася скарачэння колькасці норм у 4 разы і павышэння прадукцыйнасці на 30-40 проц.

Інстытут занят распрацоўкай мерапрыемстваў па барацьбе з усушкамі і абжогамі ў запалкавай прамысловасці, па рацыяналізацыі рабочага месца раду прафесій запалкавых фабрык, па ўкараненню вытворчай фізкультуры і т. д.

Асноўны метад дзейнасці інстытута — эксперыментальная арганізацыя работ у самім цэху, на вопытных базах. Ёсць таксама лабараторыі — псіха-фізіялагічная, света-тэхнічная, хімічная і інш.

Створан рад курсаў для грамадскіх інспектараў працы, проф- і страхактыва. Арганізуецца перасовачная выстаўка па арганізацыі аховы працы на торфараспрацоўках, якая з пачатку сезона наведае ўсе асноўныя торфазаводы БССР. М. К.

УНІВЕРМАГІ Ў РАЁНАХ

Нядаўна адкрытыя ў Лепелі і Шклове новыя раённыя універмагі паказваюць узоры пастаноўкі совецкага культурнага гандлю. Зварот лепельскага універмага даходзіць да 2000 руб. у дзень.

З першых-жа дзён работы універмаг пачаў прымаць індывідуальныя заказы на тавары. За некалькі дзён паступілі заяўкі ад калгаснікаў на наступныя прадметы: на 20 суконных і шарсцяных гарнітураў добрай якасці сінята або шэрага колера коштам да 250 руб., на 18 пар каляровых жаночых туфель на скуранай падэшве коштам да 70 руб. пара, на 10 патэфонаў з пласцінкамі і на рад іншых тавараў высокай якасці.

Шклоўскі універмаг знаходзіцца ў невялікім памяшканні, але ён добра абсталёван, ахлеен шпалерамі, мае электрычнае святло. У магазіне адкрыты аддзяленні гатовага адзення, трыкатажу, абутку, галантарэі, парфумерыі, мэблі і сілікатаў. У асобным аддзяленні прадаюцца рымарныя і гаспадарчыя тавары. Ёсць прымерачны пакойчык з люстрам.

Вялікую работу універмаг праводзіў у часе раённага злёту калгасні каў-ударнікаў. У фае тэатра, дзе адбываўся злёт, універмаг арганізаваў выстаўку тавараў і прыняў ад делегатаў заяўкі на тавары. Заказы былі выкананы праз райпаг і сельспажытаварыства. За адзін дзень злёта універмаг рэалізаваў тавараў на 3 тыс. руб.

МЯСАМАЛОЧНЫ СОЎГАС ІМЯ т. ГАЛАДЗЕДА

У Стадоліцкім сельсавеце Лельчыцкага раёна арганізуецца новы мясамалочны соўгас імя тав. Галадзеда з плошчай пахаці ў 1320 га і сенажацяй у 1530 га.

НОВЫЯ ЦАГЕЛЬНІ І ЧАРАПІЧНЫЯ ЗАВОДЫ

У бягучым годзе ўступае ў эксплатацыю рад новых цагелень і чарапічных заводаў.

У Магілеве заканчваецца будаўніцтва новай цагельні магутнасцю ў 9 мільёнаў цаглін у год. У бягучым сезоне яна дасць 3.600 тыс. штук. Цагельня поўнасцю электрыфікавана.

Новая цагельня здаецца ў эксплатацыю ў Полацку. Праграма работы на бягучы год — 2.600 тыс. штук цаглін. Для абслугоўвання цагелень у Полацку пабудавана спецыяльная электрастанцыя.

У Слуцку і Полацку будуюцца чарапічныя заводы з прадукцыйнасцю ў 1 млн. штук чарапіцы кожны. Заводы ўступяць у эксплатацыю ў другім квартале.

ФІЗКУЛЬТУРА

* Фізкультурная арганізацыя Беларусі датэрмінова выканала заданне «ГПА» па лыжах. У прывітальнай тэлеграме на імя старшыні ВСФКБ тав. Захоўскага старшыня ВСФК СССР тав. Ацінаў піша: «Узнімальце бальшую падрыхтоўку к лету. Забяспечце магутны росквіт спорта, рост спартыўнай тэхнікі. Беларусь цвёрда бяжыць у перадавых радах фізкультурных арганізацый СССР таксама ў галіне спорта». Прывітальная тэлеграма атрымана і ад сакратара ЦК ВЛКСМ тав. Гарышніна.

* ВСФК СССР запрасіў для ўдзелу ва ўсесаюзным злёце майстроў па ляжкай атлетыцы ў г. Сталіна лепшага майстра БССР тав. Ланідуса — чэмпіёна СССР па гірах, майстра Вайніловіча, заняўшага 3 месца ў СССР па гірах, і Любзікова — майстра СССР па барацьбе. 25 сакавіка каманда выязджае ў Сталіна.

* Сёння ў Цэнтральным доме фізкультуры адбудзецца гарадскі розыгрыш па баскетболу, у якім прымуць удзел 8 мужчын і 8 жанчын. Лепшыя ігракі паедуць у Кіеў для ўдзелу ва ўсесаюзным свяце па баскетболу 10 красавіка.

Адкрываем новыя магазіны

ФОТА ЕЎЗЕРЫХІНА.



На станцыі Негарэлае адкрыт новы універмаг для рабочых-чыгуначнікаў.

ПАЕЗДКА БЕЛАРУСКАГА ТРАМА У ЛЕНІНГРАД

1-га красавіка Беларускі дзяржаўны тэатр рабочай моладзі выязджае ў Ленінград. Калектыў артыстаў будзе праходзіць вучобу ў тэхнікуме сцэнічнага мастацтва. На працягу свайго прабывання ў Ленінградзе — 2½ месяцы, — тэатр падрыхтуе новую пастаноўку — класічную п'есу Мальера «Тэрцюф» у перакладзе Крапівы.

ХРОНІКА

* **УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА** па кінарабоце на вёсцы адкрываецца сёння ў памяшканні дзіцячага кінатэатра ў Менску.

* Імя тав. **ДЗІМІТРАВА** надана заводу «Адраджэнне», Магілёўскага раёна. Увесь калектыў рабочых і служачых завода ўступіў у рады МОПР.

* **ТЫРАЖ** 5-й усесаюзнай азетлатарэі адбудзецца ў Гомелі 23 сакавіка.

* **ЦЭНТРАЛЬНЫ РАБОЧЫ КЛУБ** адкрыт у Магілеве. Пры клубе арганізован тэатр рабочай моладзі, драматычны, харавы і музычны гурткі.

* **РАЁННЫ ЗЛЁТ** калгасных таварыскіх судоў адбыўся ў Магілеве. Прымала ўдзел 165 чал.

* **100 ТЫС. РУБ.** адпушчана на набудову новага будынка чыгуначнай фабрычна-заводскай семігодкі ў Калінкавічах.

* Аднагадовыя дашкольныя **КУРСЫ** на 40 чалавек адкрыты ў Оршы.

БУДЗІЛЬНІКІ ПАЛЕПША...АГА ТЫПУ

ФОТА ЕЎЗЕРЫХАНА.



Другі маскоўскі завод гадзіннікаў прыступіў к выпуску будзільнікаў палепшанага тыпу (Б-8) з знакам дворным званком. На крышцы будзільніка выштампаваны указанні макет завода асобых механізмаў. Цыферблат зроблен на бліскучай мелавой паперы. Выпуск будзільнікаў старога тыпу заводам спынен.

НА ЗДЫМКУ: Новыя будзільнікі

На вытворчых участках народнай гаспадаркі

За трэцюю пяцідзеўку сакавіка

АБУТАК.

Менская абутковая фабрыка імя тав. Кагановіча выпусціла 19.821 пару абутку, з іх мальчуковых 8.566 пар і мужчынскіх 11.265 пар. Адхіленне выпуску прадукцыі ад першага гатунка — —32,03 проц. замест планавых 13,5 проц.

Фабрыка імя Тэльмана (Менск) зрабіла 594 пары дзіцячых бацінак, 1.938 пар мальчуковых, 162 пары жаночых паўбацінак, 1.850 пар балетак і 1.359 парам ботаў зроблена рэстаўрацыя. Усяго выраблена прадукцыі за пяцідзеўку на суму ў 37.300 руб.

Віцебскай абутковай фабрыкай імя Ленерта зроблена 6.635 пар абутку—103,4 проц. задання на суму ў 161.293 руб.

ШВЗІНЫЯ ВЫРАБЫ.

Масавы цэх швзінай фабрыкі імя 8 сакавіка (Менск) пашыў 8.570 штаноў. У працягдзінах фабрыка выканала план на 65 проц. з іх па цэху індывідуальных заказаў—75,9 проц.

ХІМІЧНЫЯ ВЫРАБЫ.

Завод «Чырвоны хімік» выпусціў за пяцідзеўку 4 тоны мала. Усяго прадукцыі заводам выпушчана на суму ў 49.318 руб.

МЕТАЛІЧНЫЯ ВЫРАБЫ.

Завод ланцугоў Галя зрабіў ланцугоў 667 метраў (план 800) для снопа-вязалак і 472 метры (план 1.600) ланцугоў для веласіпедаў. Усяго выраблена на суму ў 19.743 руб.

ШТУЧНАЕ ВАЛАКНО.

Магілеўская фабрыка імя Куйбышэва дала 24.480 кілограм штучнага валакна або 101,6 проц. задання.

ТРЫКАТАЖ.

Віцебскай панчошнай фабрыкай імя Клары Цэткін выпушчана 165.480 пар панчох або 105 проц. задання, на суму ў 161.199 руб.

МАРГАРЫНАВЫ ВЫРАБ.

Гомельскім маргарынавым заводам загатоўлена 92,5 тон сталовага маргарыну на суму ў 111.000 р.

Паведамленне

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 22 сакавіка 1934 г. у 10 гадз. раніцы ў г. Менску (дом Урада, правае крыло, 2-гі паверх, пакой 266) будзе засядаць Рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый на пастановы камісій: менскай, ушацкай, суражскай, брагінскай, лепельскай, дзержынскай, пухавіцкай, крупскай, рагачоўскай, барысаўскай, жлобінскай, веткаўскай, заслаўскай, полацкай, чэрыкаўскай, чэрвеньскай, стара-дарожскай, быхаўскай, горацкай, петрыкоўскай, віцебскай, дрысенскай, талачынскай мазырскай, ельскай і ПП АДПУ БССР — наступных таварышоў:

Калоша Г. П. (яч. вагонцага дэпо), Гоман Н. Р. (яч. Белдрэў), Гальперын Н. К. (ф-кі «Окцябр»), Кучмель І. С. (УНР-91), Кранкоў Т. Н. (ЦСПСБ), Савасцьянава Н. П. (медтэхнікума), Баранчык В. Ф. (яч. паравознага дэпо), Максімовіч Г. М. (яч. ВПІ), Нікалаеў Е. С. (соўгас «Горкі-Ашчак»), Хмялеўская Н. В. (ЦК КП(б)Б), Хурманёнак А. М. (Галоўдартранс), Рубін І. А., Шуцеровіч Ю. Ш., Рубін Х. А. (партканцэлярыя абутк. фабрыкі імя Кагановіча), Сабінцер Г. Х. (яч. Белпрамбудтрэста), Залманава М. М. (яч. ВПІ), Зайцаў Р. О. (яч. Калодзішчанскага сельсавета), Кейлес Г. Х. (яч. Дома Урада) (Менск).

Гіндзін С. Г., Гіндзін М. Г., Ковшаў І. А. (Вушачы); Пятроў М. А., Іватаў П. Д. (Сураж), Сіваладаў В. А., Ціхончук М. А., Гарошка І. М. (Брагін); Шафрая Я. Д., Коўшыкаў Ф. Н. (Лепель); Хулякоў І. В. (Дзержынск); Небажэнка Т. А. (Пухавічы); Зяткін Л. Ф., Буртаць Т. І. (Прапойск); Рубаліх С. Т. (Рагачоў); Карнажыцкі Ф. І. (Барысаў); Яцуцка І. І. (Жлобін); Погарцаў І. В. (Ветка); Гершэдзевіч І. О. (Заслаўль); Рубін А. Ф. (Полацк)); Карпенка Т. І. (Чэрыкаў); Найдорч Н. А. (Чэрвень); Ляўкевіч Ф. М. (Ст. Дарогі); Фрыдман М. Ю. (Быхаў); Кірыленка Н. І. (Глуск); Шаўцоў А. Н. (Парычы); Сцяпняк Н. Н. (Горкі); Зянкевіч П. Д. (Петрыкаў); Гаўрыленка С. І. (Віцебск); Сафроненка Т. Г. (Дрыса); Зайкоўскі Д. П. (Талачыно).

Шыпікаў С. Е., Іваноў М. С. Ошман М. І. (Менск ПП АДПУ БССР), Падалец І. Г. (Мазыр), Барановскі Э. А. (Ушачы), Каплан М. В. (Ельск).

У сувязі з тым, што многія таварышы, падаўшыя апеляцыі, не гадзячы на неадназразовыя выклікі, не з'яўляюцца, Рэспубліканская камісія заўважае, што справы неяўшыхся будуць перададзены ў архіў без разгляду.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Кіно „ПРОЛЕТАРЫЙ"
Сёння, 20 сакавіка і штодзённа
МАСТАЦКАЯ ДРАМА
па роману Фердынанда ДЮШЭНА „Таміда"
ЗА ШТО ЯЕ СУДЗІЛІ
Штодзённа 5 сеансаў.
Пачатак сеансаў у 6 г., 7-15, 8-30, 9-45. 11. КАСА—з 4 гадзін.

КІНО „СПАРТАК" Ад 20 сакавіка ПАТ І ПАТАШОН у замежнай камедыі
ЗАГАДКА МЛЫНА
у 6 частках
У праграме Саюзкінохроніка
„НА СТРАЖЕ СССР" № 11—1933 г.
Штодзённа 5 сеансаў. Каса—з 4 гадз. дня.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" ПРЭМ'ЕРА! ПАРУЧЫК КІЖЭ У праграме гукавая кіно-хроніка
Кіно Інтэрнацыянала МАСТАЦКІ замежны фільм КАХАННЕ ІСПАНКІ
Дзіцячы гукавы кіно-тэатр Вечэрнія сеансы Толькі для дарослых гукавы мастацкі фільм ЦІХІ ДОН

Полацкі аўтатрактарны тэхнікум абвяшчае НАБОР на чатырохмесячныя КУРСЫ трактарыстаў і васьмімесячныя КУРСЫ брыгадзіраў пры тэхнікуме.
Прымаюцца асобы рабочыя і калгаснікі ва ўзросце ад 18 год з асвітай 4 груп.
На курсы брыгадзіраў прымаюцца асобы з вытворчым стажам трактарыста не менш 2 год.
Прыём—з 25 па 30 сакавіка.
Прыязджаючыя павінны мець дакументы: аб соцстаноўшчы і паходжанні, аб'ектыве, нараджэнні і аб здароўі.
Курсанты зачыслечваюцца стыпендыяй ад 50 да 60 р., інтэрнатам і сталоўкай.
Пасцельныя прылады трэба ўзяць з сабой.
Адрас: г. Полацк, Карла Маркса, 43
"ДЫРЭКЦЫЯ.

23 сакавіка ПАМЯШКАННЕ ПОЛЬСКАГА ДЗ. ТЭАТРА 24 сакавіка
ДВА КАНЦЭРТЫ
ПРЭМ'ЕР ВЯЛІКАГА МАСКОЎСКАГА АКАДЭМІЧНАГА ТЭАТРА САЮЗА ССР.
Александр БАТУРЫН (бас)
Лаўрэатка Ленінградскай кансерваторыі
Роза УМАНСКАЯ (скрыпка)
Салістка Вялік. акадэм. тэатра Саюза ССР
Вера ДУЛАВА (арфа)
Б. ГОЛІКМАН (раяль)
Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатра.
ПА ЗАЯЎКАХ—СКІДКА

УСІМ ПРАПАГАНДЫСТАМ І СЛУХАЧАМ СОЎПАРТШКОЛЫ
20-га сакавіка,
у 7 гадз. вечара ў Доме Комасветы (Вялікі зал) АДБУДЗЕЦЦА
ЗВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ
тав. АГУЛЬНІКА
па пройдзенай частцы курса гісторыі партыі.
Усе слухачы і прапагандысты соўпартшкол павінны абавязкова з'явіцца на лекцыю.
ДОМ КОМАСВЕТЫ.

Радыё-адд ел Беларускага кіраўніцтва сувязі даводзіць да ведама прадпрыемстваў і ўстаноў, што
з 20 САКАВІКА
пры Менскай паштовай канторы станаўляецца
ПРЫЁМ РАДЫЁГРАМ.
Радыёграмы прымаюцца на ўсе раёны БССР.
Прыём вытвараецца з 12 да 16 г. дня.
Прыём радыёграм у Доме Урада пры радыёаддзеле СПЫНЯЕЦЦА.
РАДЫЁАДДЗЕЛ.

Беларускае аддзяленне САЮЗСНАБАСОАВІЯХІМА
даводзіць да ведама ўсіх арганізацый і яч. АСО
не заключыўшых дагавароў на скабжэнне іх неабходнай для работы яч. АСО
мясцовасцю ў 1934 годзе аб тым, што яны п а в і н н ы
заключыць ДАГАВАРЫ не пазней 25 сакавіка г. г.
НЯПЛАНАВЫЯ І ВЫПАДКОВЫЯ ПАКУПНІКІ З ПРЫЧЫНЫ АБМЕЖАВАНАСЦІ ВЫДЗЕЛЕНЫХ НАМ ФОНДАЎ АДДЗЯЛЕННЯМ СНАБЖАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.
ДАГАВАРЫ і намянклатуру тавараў можна атрымаць па адд. САЮЗСНАБА (АХ: г. Менск, Ульянаўская 5-17, дом ЦС АСО БССР.
БЕЛСНАБ АСО.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1934 год
НА ГАЗЕТУ „ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА"
орган Арганізацыйнага камітэта Саюза совецкіх пісьменнікаў і Кіраўніцтва мастацтвам БССР
Газета выходзіць пры ўдзеле лапшых совецкіх пісьменнікаў і работнікаў мастацтва
Газета выходзіць 6 разоў у месяц
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 месяц — — — 1 руб. 20 кап.
3 месяцы — — 3 руб. 60 кап.
6 „ — — 7 руб.
12 „ — — 14 руб.
Цана асобнага нумара—20 кап.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсімі аддзяленнямі Саюздруку і ўсімі кнігарнямі Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі.

ЕЛЬСКАЕ АДДЗ. ДЗЯРЖБАНКУ
з прычыны непагашэння запазычанасці па выданым крэдытам
ПРАДАЕ наступныя лесаматэрыялы Ельскага лесярамгаса.

НАЗВА МЕЙСЦА	Буд. матэрыялы	Дровы
У лесе	12500 куб.м.	15865 раўметр.
Навузкавалейцы	9805 „ „	10900 „
На чыгуначных пунктах.	16612 „ „	15123 „
На сплаў-пунктах	17549 „ „	30623 „

ЦЭНЫ ПА ПРЭЙСКУРАНТУ.
Зварачацца: Ельск (БССР) ДЗЯРЖБАНК.

ПРАДАЎЖАЕЦЦА
ПРЫЕМ ПАДПІСКІ
з 1-IV—1934 г.
„СОВЕТСКОЕ ИСКУССТВО"—
орган сектара мастацтва Наркамасветы—выходзіць пры ближэйшым удзеле Інстытута ЛІМ Комакадэміі і Усероскомарэма. Газета па пытаннях тэатра, музыкі, выяўленчага і красторавага мастацтва.
ВЫХОДЗІЦЬ 1 РАЗ у 6 ДЭН.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:—
12 мес—12 руб.,
6 мес.— 6 руб.,
3 мес.— 3 руб.
„ТЕАТР и ДРАМАТУРГИЯ"—.
Грамадска-палітычны, мастацкі журнал тэатра, драматургіі і крытыкі,
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
12 мес.—72 руб.
6 мес.—36 руб.
3 мес.—18 руб.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Масква, 6. Страстной бульвар, 11, Жургазабяднаннем і ўсюды поштай і аддзяленнямі Саюздруку.
ЖУРГАЗАБ'ЯДНАННЕ.

Сёння, у 6 гадз. вечара, трэст Белдзяржкіно СКЛІКАЕ
ПЕРШУЮ ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ
па пытаннях КІНО-РАБОТЫ НА ВЁСЦЫ.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Рашэнні XVII з'езда ВКП(б) і задачы кіно- абслугоўвання на вёсцы (дакл. заг. адзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б тав. КОНІК)
2. Становішча кіно-работы на вёсцы і мерапрыемствы па паляпшэнню кіно-абслугоўвання (дакл. кіраўнік трэста Белдзяржкіно тав. ГА (КІН).
Нарада адбудзецца у памяшканні дзіцячага кіно-тэатра (Совецкая, 90).
Уваход па дэлегацкіх мандатах і запрашальных білетах.
Белдзяржкіно.

СТАРТ ВАРАШЫЛАЎСКАЙ АБАРОННАЙ ЭСТАФЕТЫ.
Сёння, 20-га сакавіка, у 6 гадзін вечара, у памяшканні Дома Культуры (Яўрэйскі Тэатр)
на ўрачыстым пасяджэнні Усебеларускага штаба Варашылаўскай Абаронай Эстафеты
сумесна з комсамольскім, асоавіяхімаўскім і прафесіянальным актывам гор. Менска і перадавых вучэк Асоавіяхіма БССР, будзе дан
старт эстафеты ў Маскву з рэзалюцыі Пленуму ЦК ВЛКСМ, ОАХ СССР і ЦК ВЛКСМ.
Прапануецца ўсім старшыням вучэк Асоавіяхіма і сакратарам вучэк ЛКСМ з'явіцца ў гор. Совет Асоавіяхіма—вул. Энгельса, д. № 28 (супроць сквера) за атрыманнем білетаў.
Пасля пасяджэння—КАНЦЭРТ.

Менгорбюро „САЮЗДРУК"
даводзіць да ведама падпісчыкаў, што
АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ
на газеты і журналы на красавік і другі квартал
ПАДПІСКУ ЗДАВАЙЦЕ: упаўнаважаным „Саюздруку", на пошту (другі паверх), лістаносцам і газетным кіоскам.
ПАТ АБУЙНЕ пры здачы падпіскі квітанцыі з пячаткаю.
АПОШНІ ТЭРМІН здачы падпіскі: на цэнтральныя (маскоўскі) друк—23 сакавіка, на рэспубліканскі (Менскі) друк—25 сакавіка.
Пасля ўказаных тэрмінаў падпіска ПРЫМАЦЦА НЕ БУДЗЕ
МЕНГОРБЮРО „САЮЗДРУКУ".

Менск, друкарня «Звязды». Упоўн. Галоўлітбела № К—254